Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
№ 86 (28450)
10 МАЯ 2017 г. СЕРАДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
стар. 5–12

# ПОДЗВІГ У ІМЯ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

## Беларусь адзначыла дзень Перамогі

**У беларускай гісторыі нямала лёсавызначальных дат. Але 9 мая 1945 года — асаблівы дзень. Вялікая Перамога заваявана ў самай страшнай вайне. За гады Вялікай Айчыннай вайны Беларусь згубіла трэць свайго насельніцтва. У адным толькі лагеры смерці «Трасцянец» пад Мінскам фашысты знішчылі больш за 200 тысяч чалавек. Безліч людзей загінула ў спаленых карнікамі вёсках і зруйнаваных гарадах... Тым не менш мы выстаялі і змаглі адрадзіць краіну. І сёння мір, спакой, стабільнасць вызначаюць дзяржаўную палітыку нашай краіны.**


Фота БЕЛТА.

Учора на ўрачыстай цырымоніі ўскладання вянкоў да манумента Перамогі ў Мінску з нагоды 72-й гадавіны Вялікай Перамогі Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў:

— Злачынствы нямецка-фашысцкіх захопнікаў з памяці людзей не выкрасліць. Гэта павінны ведаць у тым ліку і тыя, хто сёння робіць спробы перапісаць гісторыю, адняць Вялікую Перамогу ў нашага народа. Дапусціць гэтага мы не можам. І ніколі не перастанем схіляцца перад мужнасцю сваіх землякоў, якія прайшлі праз пякельны агонь вайны.

Подзвігам стала не толькі змаганне нашых суайчыннікаў на франтах, у партызанскіх атрадах, у падполлі. Адрадзіць беларускія гарады і вёскі з руін і попелу было таксама няпроста. Звяртаючыся да ветэранаў вайны і працы, Прэзідэнт заявіў: усё, што яны зрабілі для Радзімы, не будзе забыта.

— На вашым прыкладзе вучацца і будуць вучыцца ўсе пакаленні беларусаў. Бо не можа быць нічога больш годнага, чым ахвярны подзвіг у імя свабоды і незалежнасці. З гадамі мы разумеем гэта ўсё больш востра, асабліва сёння, калі вас, дарагія ветэраны, становіцца ўсё менш і менш, і калі ўзрастае міжнародная напружанасць, адраджаюцца ідэі сусветнага панавання, у розных рэгіёнах планеты палаюць узброеныя канфлікты. Чалавецтва апынулася каля небяспечнай рысы новай вялікай вайны, — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Пагрозам падвяргаецца і наша Беларусь.

— Каля нашых межаў збіраюцца ваенныя арсеналы. Літаральна па суседстве — у былых савецкіх рэспубліках — размяшчаюцца ваенныя базы. Праводзяцца баявыя вучэнні і манеўры. З дапамогай нашай унутранай «пятай калоны» прадпрымаюцца спробы дэстабілізаваць абстаноўку ўнутры краіны. Таму асаблівую значнасць набываюць пільнасць і гарантыя бяспекі краіны. Як зрэнку вока неабходна берагчы мір і бяспеку ў нашым родным доме.

Па словах кіраўніка дзяржавы, калі мы зможам зберагчы мір і спакой на нашай зямлі, гэта будзе самы вялікі падарунак не толькі для жывых ветэранаў, але і для тых, хто аддаў жыццё за ўсё тое, чым мы сёння карыстаемся.

— З нашай зямлі ніколі не зыходзіла і не будзе зыходзіць агрэсія. Мы даказалі ўсім, што Беларусь мірная і дружалюбная краіна. Але гэта не значыць, што яна не можа за сябе пастаяць. Так, чужога нам не патрэбна, але і свайго мы не аддадзім. Так навучылі нас нашы гераічныя продкі, і мы будзем верныя іх святому запавету, — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

СТАР. 2

■ Круглы стол

# ДЗЕ БУДЗЕ МУЗЕЙ ДЗЯДЗЬКІ КОСЦІ?

### Мемарыялізацыя памяці аб легендарным партызанскім камандзіры патрабуе асаблівай увагі

**Наша газета ўжо пісала пра тое, што ў Оршы знеслі Мемарыяльны музей Героя Савецкага Саюза Канстанціна Заслонава. Пра гэта «паклапаціўся» леташні ліпеньскі ўраган, які не пакінуў шанцаў на рэстаўрацыю. Але фактычна музей працягвае існаваць — часова экспазіцыя знаходзіцца на выставачнай пляцоўцы Аршанскага музея гісторыі і культуры горада.**

Сёння ставіцца пытанне аб тым, дзе на пастаянннай аснове размясціць музейныя прадметы, звязаныя з жыццём і дзейнасцю легендарнага чыгуначніка. Аршанскі райвыканкам, які з'яўляецца заснавальнікам установы культуры, прапануе прыстасаваць пад музей гістарычны будынак у цэнтры горада. Не адмятаецца і такі варыянт, што музей будзе пабудаваны наноў каля чыгуначнага вакзала — на тым самым месцы, дзе ён знаходзіўся больш чым 60 гадоў. Але пакуль ідуць размовы, патэнцыйныя наведвальнікі прыходзяць на пустку. У лепшым выпадку ідуць «да Заслонава» — туды, дзе ён часова «прапісаўся».

Пра будучыню аднаго з найстарэйшых музеяў краіны пагутарылі падчас круглага стала, які прайшоў у Выдавецкім доме «Звязда». У абмеркаванні прынялі ўдзел **намеснік старшыні Аршанскага райвыканкама Алег СМІРНОЎСКІ, дачка Героя Савецкага Саюза Ірына ЗАСЛОНАВА, галоўны спецыяліст упраўлення ўстаноў культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Анжаліка ЯНКОЎСКАЯ, начальнік сектара ідэалагічнай і сацыяльна-культурнай работы Мінскага аддзялення Беларускай чыгункі Аксана СМАРГОВА.**

СТАР. 4



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

ISSN 1990 - 763X

# ПОДЗВІГ У ІМЯ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ


Фота БЕЛТА.

## За мір у краіне народ можа не перажываць

Учора Прэзідэнт адказаў таксама на пытанні прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі, прысвечаных як абароне незалежнасці нашай краіны, так і сітуацыі ў свеце, добраўпарадкаванню вёсак і правядзенню чэмпіянату свету па хакеі ў Беларусі праз некалькі гадоў.

Беларусь як ні адна з краін ведае, што такое вайна і чаго каштуе мір. Каментуючы тое, якія ёсць галоўныя пагрозы нашай бяспецы сёння і што будзе рабіць наша дзяржава, каб павысіць узровень сваёй баявой гатоўнасці, Прэзідэнт заявіў:

— Натуральна, лепш было б не ведаць таго, што было. Але, на жаль, гісторыя не церпіць умоўнага ладу. Усё гэта было. І мы павінны здабываць з любой падзеі ўрок. Як бачыце, мы гэтыя ўрокі здабываем... Мы разумеем, што порах трэба трымаць сухім. Але самае галоўнае: у мірны час гарматы павінны быць у чахлах. І расчахляць іх можна толькі на вучэннях. Што мы, дарэчы, і робім. Самае галоўнае для нас, якія б ні адбываліся недзе падзеі, — гэта эканоміка. Будзе нармальна развівацца краіна — мы захаваем мір, бяспеку і ўнутраную стабільнасць. Наш народ можа за гэта не перажываць. У нас ёсць усё для таго, каб абараніць кавалачак зямлі, на якім жывуць нашы людзі.

Прэзідэнт звярнуў увагу: ужо тры разы літаральна за два дзесяцігоддзі мы рэфармуем, перабудоўваем, удасканальваем нашы Узброеныя Сілы, робім высновы з таго, што адбываецца ва ўсім свеце.

— Свет крайне неспакойны, ідуць войны, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Мы пільна назіраем за тым, што адбываецца, робім вывады і ў сувязі з гэтым прыстасоўваем свае Узброеныя Сілы. Таму яшчэ раз паўтараю, вы можаце не перажываць за спакой і мір у нашай краіне. Галоўнае, каб у нас заўсёды было адзінства ўнутры краіны. Будзе яно — справімся з любымі пагрозамі.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## Мігранты хочуць выратавацца

Нягледзячы на вялікую колькасць бежанцаў з Украіны, якіх прыняла наша краіна ў апошнія гады, гэта не пацягнула за сабой дэстабілізацыю ў грамадстве, пагрозу нацыянальнай бяспецы. Наконт такога тэзіса Прэзідэнт заявіў:

— Хачу звярнуць вашу ўвагу на адну рэч: вельмі важна, з якім настроем і адкуль едзе чалавек. Да нас прыехалі ўкраінцы. Яны прыехалі, таму што мы разварушылі іх дом? Не. Яны прыехалі для таго, каб выратавацца самім і выратаваць свае сем'і. Яны ўцякаюць ад той разрухі, якая адбываецца ў іх на ўсходзе Украіны. Яны едуць да нас як да людзей, якія павінны ім дапамагчы. Вось іх настрой. Што адбываецца на Блізкім Усходзе, адкуль лінула ў Еўропу хваля перасяленцаў? Туды прыйшлі ў тым ліку і еўрапейцы. Памятаеце гэтую арабскую дугу? І пачалі з Туніса. Цудоўная была краіна, усе туды ехалі, адпачывалі, курорты цудоўныя на ўзбярэжжы Міжземнага мора... Навошта было пераварочваць гэту краіну? Пачалі бамбіць, разбілі, пераварушылі — «дэмакратыю» прынеслі. Далей — больш.

У баявых дзеяннях загінулі многія і многія людзі, у тым ліку жанчыны, дзеці. Гэта стала адной з прычын развіцця тэрарызму. І вось бежанцы хлынулі ў Еўропу: нехта з мэтай адпомсціць, нехта — з мэтай знайсці працу.

— І таксама другое пытанне: як іх прынялі? Рэзервацыі, асобныя пасяленні... Яны пастваралі свае анклавы — з гэтым настроем... Вось у чым розніца паміж намі і другімі краінамі, якія мусілі іх (мігрантаў. — **Заўв. рэд.**) ехаць да іх на радзіму ў пошуках кавалка хлеба, не кажучы ўжо пра шчасце. Таму трэба быць больш уважлівымі да людзей, тады атрымаеш дабрыню ў адказ.

## Інфраструктура будзе, калі будзе насельніцтва

Адказваючы на пытанне пра развіццё невялікіх населеных пунктаў, якое ўзнімалася падчас Паслання беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што, сапраўды, буйныя гарады, аграгарадкі ўжо прыведзены ў парадак. Што да невялікіх вёсак, то іх таксама неабходна добраўпарадкаваць.

— І калі людзі будуць там жыць, мы абавязкова мадэрнізуем, адрамантуем інфраструктуру для іх, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Мы будзем рабіць гэта па ўсёй краіне.

Яшчэ адно пытанне датычылася магчымага правядзення чэмпіянату свету па хакеі ў 2021 годзе ў Беларусі. Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што правядзенне ў нашай дзяржаве турніраў міжнароднага ўзроўню дазваляе не столькі павысіць імідж краіны або прыцягнуць турыстаў, колькі падштурхнуць да развіцця спартыўную сферу. Што да чэмпіянату свету па хакеі, то нават калі мы не атрымаем магчымасці правесці яго ў нас у 2021-м (а сапернік вельмі прыстойны, Фінляндыя), то атрымаем у 2022-м ці 2023-м. Па словах Прэзідэнта, мы абавязкова прывязём чэмпіянат свету па хакеі ў сваю краіну.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*


Фота БЕЛТА.

## ■ Меркаванні

## ...МАГЧЫМАСЦЬ СКАЗАЦЬ «ДЗЯКУЙ»

**Да манумента Перамогі 9 мая прыйшлі тысячы людзей. Гэта ветэраны, замежныя дыпламаты, высокія чыноўнікі, духоўныя асобы... Усе яны сыходзіліся на адной думцы: гэты дзень — магчымасць яшчэ раз падзякаваць тым, хто здабыў Перамогу.**

**Андрэй КАБЯКОЎ, прэм'ер-міністр Беларусі:**

— У гэты дзень з болем, горыччу ўспамінаем пра тых, хто сышоў, пра пакалечаных, параненых, якія пасля вайны аднаўлялі вялікую краіну. Хацелася б, каб тыя людзі, якія прыйдуць ім на змену, былі іх дастойныя. А наша сённяшняя справа — зрабіць так, каб эканамічны патэнцыял краіны аднаўляўся як мага хутчэй і адначасова не забываць пра тое, што любая дзяржава павінна ўмець сябе абараняць.

**Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі ПАВЕЛ, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі:**

— Наш народ пражыў вельмі цяжкія гады акупацыі, разгрому, пралітай крыві і загінуўшых людзей, наш народ ведае цану міру. Наша задача — рабіць правільныя высновы з гісторыі. Хочацца пажадаць, каб ніколі не паўтаралася тое, што было ў тыя далёкія 40-я гады.

**Станіслаў ЗАСЬ, дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Беларусі:**

— Сёння вельмі вялікае і знамянальнае свята для кожнага беларуса, для ўсёй краіны. Кожны год яно адзначаецца з асаблівым цёплым пачуццём — пачуццём гонару за пакаленне, што годна выканала свой абавязак перад краінай, перад нашчадкамі і забяспечыла нам спакойнае і шчаслівае жыццё.

**Архіепіскап Тадэвуш КАНДРУСЕВІЧ, мітрапаліт Мінска-Магілёўскі:**

— Прайшло шмат гадоў пасля завяршэння Другой сусветнай вайны, аднак людзі памятаюць. У Беларусі, ва ўсім свеце, адзначаецца гэтая дата — памяць пра тых людзей, якія аддалі сваё жыццё, якія ахвярна ішлі ў бой, дзякуючы якім мы сёння можам мірна жыць.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Эмануэль Макрон разлічвае «ўзяць» большасць дэпутацкіх мандатаў



Як вядома, у мінулую нядзелю ў Францыі прайшоў другі тур прэзідэнцкіх выбараў. Экс-міністр эканомікі краіны Эмануэль Макрон атрымаў перамогу з вынікам 66,1%, сведчаць звесткі міністэрства ўнутраных спраў краіны. Свае галасы Макрону аддалі больш за 20,7 мільёна выбаршчыкаў. Лідар партыі «Нацыянальны фронт» Марын Ле Пен атрымала звыш 10,6 мільёна галасоў (33,9%).

Эмануэль Макрон асабіста пагутарыў з лідарамі ЗША, Вялікабрытаніі, Германіі, Турцыі і Канады, перадае агенцтва «Франс Прэс» са спасылкай на камюніке руху «Наперад!», якое ўзначальвае абраны прэзідэнт. Адзначаецца, што Макрон таксама атрымаў шэраг пісьмовых віншаванняў, у тым ліку ад Прэзідэнта Беларусі. Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Эмануэля Макрона з выбраннем на пасаду Прэзідэнта Французскай Рэспублікі, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. «Карыстаюся выпадкам, каб выказаць зацікаўленасць у пашырэнні беларуска-французскіх сувязяў у палітычнай, гандлёва-эканамічнай, гуманітарнай і іншых галінах, развіцці канструктыўнага ўзаемадзеяння паміж нашымі дзяржавамі ў міжнародных арганізацыях», — адзначаецца ў віншаванні. Кіраўнік дзяржавы разлічвае на падтрымку ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Францыяй дзеля росквіту і дабрабыту народаў дзвюх краін.

Новаабраны прэзідэнт абвясціў, што свой першы замежнапалітычны візіт здзейсніць у краіну-лакаматыў Еўрасаюза, Германію. «Мы нясём адказнасць за будучыню нашай краіны. Мая адказнасць заключаецца ў тым, каб знізіць той страх, які ёсць у грамадстве, і зрабіць велізарны крок у будучыню», — сказаў Макрон, паабяцаўшы быць прэзідэнтам усіх французаў і ўспомніўшы «вялікую гісторыю Францыі», годным нашчадкам якой яму і яго суайчыннікам трэба быць.

Марын Ле Пен у сваёй паслявыбарнай прамове, прызнаўшы сваё паражэнне, таксама казала пра гісторыю: свой вынік на выбарах яна назвала гістарычным. Але ў ультраправых не атрымлівацца схаваць расчараванне: прагназуемых 40% галасоў іх лідар, якая прайграла ў другім туры, так і не набрала.

Рух «Наперад!» Эмануэля Макрона адразу ж пасля выбараў кіраўніка дзяржавы пачынае падрыхтоўку да новай не менш важнай бітвы. Мэта — атрымаць большасць дэпутацкіх мандатаў у Нацыянальнай асамблеі, ніжняй палаце парламента. Рух, які створаны менш за год таму, будзе прадстаўлены практычна ва ўсіх выбарчых акругах — іх у Францыі 577. Але пакуль вядомыя імёны толькі 14 кандыдатаў. На агульных выбарах рух пойдзе пад новай назвай — хутчэй за ўсё будзе перайменаваны ў «Рэспубліка, наперад!».

Два туры парламенцкіх выбараў у Францыі прызначаны на 11 і 18 чэрвеня. Палітычнай сіле Эмануэля Макрона — ён дарэчы ўжо падаў у адстаўку з пасады кіраўніка руху — прадказваюць на іх каля 24% галасоў. Аднак яго асноўныя палітычныя сапернікі адстаюць не нашмат, што можа перашкодзіць Макрону атрымаць парламенцкую большасць, неабходную для правядзення абяцанкаў у перадвыбарнай праграме пераўтварэнняў.

# 114 ГЕРОЯЎ У СТРАІ



Ветэран Вялікай Айчыннай вайны Уладзімір КУЛЬБАШЛІ.

Святкаванне 9 мая ў Магілёве пачалося на плошчы Леніна з урачыстага марша вайсковых часцей Магілёўскага воінскага гарнізона. **Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Уладзімір ДАМАНЕЎСКІ** асабіста павіншаваў кожнага з ветэранаў. Апошнія гады ім для ўдзелу ў парадзе прадастаўляецца транспарт.

Святочная калона з удзелам ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, кіраўніцтва вобласці і горада, прадстаўнікоў працоўных калектываў, грамадскасці і моладзі рушыла па вуліцы Першамайскай. Шэсце ўзначальвала вялікае палотнішча Сцяга Перамогі. Нашчадкі пераможцаў пранеслі партрэты 114 Герояў Савецкага Саюза, ураджэнцаў Магілёўшчыны. Да бессмяротнага палка з фотаздымкамі сваіх родных-франтавікоў далучылася шмат магіляўчан. На плошчы Славы да вечнага агню ляглі вянкі і кветкі, у гонар абаронцаў і вызваліцеляў прайшоў урачысты мітынг.

— Чым далей ад нас ваенныя гады, тым глыбей мы ацэньваем гэты вялікі подзвіг у гонар народа. Шаноўныя ветэраны, вы паказалі вялікі прыклад мужнасці. Наш доўг памятаць пра гэта і берагчы мір. Дзякуй вам за ўсё, — звярнуўся да ветэранаў Уладзімір Даманеўскі.

Пасля святочнага канцэрта на плошчы Славы ўрачыстасці працягнуліся ў Пячэрскім лесапарку. На цэнтральнай сцэне і салдацкай паляне да самага вечара ішлі тэматычныя музычныя праграмы. У раённых цэнтрах святочныя мерапрыемствы адбыліся на цэнтральных плошчах, у гарадскіх парках культуры і адпачынку, скверах, а таксама каля раённых Дамоў культуры. Там жа на сцэнічных пляцоўках настрой узнімалі калектывы аматарскай і народнай творчасці.

Больш за 150 прадпрыемстваў гандлю і бытавога абслугоўвання падрыхтавалі 9 мая акцыі і зніжкі на тавары і паслугі. У 40 раённых цырульнях ветэраны і прыраўнаваныя да іх асобы маглі зрабіць простую стрыжку бясплатна, а на іншыя паслугі дзейнічалі зніжкі ад 10 да 15%. У гэты дзень таксама можна было сэканоміць да кошт хімічнай чысткі форменнай вопраткі і мыцця бялізны.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

# НАМ ПАШАНЦАВАЛА ЖЫЦЬ ПОБАЧ З ВЕТЭРАНАМІ

Пра гэта казаў **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ** падчас святочных мерапрыемстваў у гонар 9 мая.

— Прыклад ветэранаў вельмі важны — і ваенных подзвігі, і пасляваеннае жыццё, — адзначыў ён падчас сустрэчы з удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны. — Дзякуючы намаганням франтавікоў узнаўлялася Беларусь, якая сёння з'яўляецца свабоднай і прагрэсіўнай краінай. Ветэраны — яе нацыянальны здабытак.

Яшчэ два гады таму, да 70-годдзя Перамогі, у вобласці было ўручана звыш тысячы трохсот юбілейных медалёў, а цяпер у рэгіёне пражывае каля 780 ветэранаў, сярэдні ўзрост якіх больш за 90 гадоў.


Ветэран Вялікай Айчыннай вайны Вялянціна БАРАНАВА.

Уладзімір Краўцоў запэўніў, што ў рэгіёне будзе і надалей весціся работа па ўвекавечанні памяці ахвяр і герояў вайны. Да Дня Перамогі ўсе памятныя мясціны, мемарыялы, брацкія пахаванні прыведзены ў парадак, сюды ўскладзены гірлянды і кветкі падчас святкавання.

На 9 мая многія гродзенцы сабраліся на Кургане Славы, дзе адбыўся ўрачысты мітынг і парад — паказальныя выступленні войскаў Заходняга аператыўнага камандавання. У вайну на гэтым месцы быў абаронны раён, летась на тэрыторыі Кургана Славы створаны комплекс «Лінія Карбышава». Ваенны генерал перад вайной займаўся ўмацаваннем заходніх межаў, дзякуючы гэтаму пад Гроднам савецкія войскі трымалі абарону некалькі дзен.

Зараз тут выстаўлены ўзоры тэхнікі ваенных часоў, а таксама сучасныя гарматы і танкі. Плануецца, што да 2020 года на «Лініі Карбышава» з'явіцца вялікі музейны комплекс з экспазіцыямі, прысвечанымі ўзброеным сілам, партызанам, памежнікам і нават маракам — ураджэнцам Гродзеншчыны.

Дарэчы, Дзень Перамогі гродзенцы адзначылі не толькі на гарадскіх пляцоўках, дзе была падрыхтавана вялікая святочная праграма, але і на вадзе. У гэты дзень адбыўся патрыятычны сплаў на байдарках па Нёмане. Удзел у ім прынялі каля 30 аматараў-воднікаў з гарадоў Беларусі. Многія ўдзельнікі апрануліся ў салдацкую форму, а стартавалі яны пад гармонік і ваенныя песні. У Гродзенскім раёне напярэдадні Дня Перамогі прайшоў велапрабег «Ад памяці да памяці» — па маршруце былой умацавальнай «Лініі Молатава», якая ўключае ў сябе кальцо абарончых дотавых збудаванняў і фартоў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** *margo@zviazda.by*

# І МУЗЫКА ДУХАВЫХ АРКЕСТРАЎ

Напярэдадні 9 мая **старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай ШАРСТНЁЎ** павіншаваў тых, каму мы абавязаны Перамогай. Ён у сваім выступленні адзначыў, што, на жаль, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, былых партызан і падпольшчыкаў застаецца ўсё менш. Губернатар падкрэсліў, што ветэраны з'яўляюцца аўтарытэтамі для маладзейшых пакаленняў. І добра, што падчас кожнага Дня Перамогі на мерапрыемствах шмат моладзі. Гэты дзень стаў па-сапраўднаму народным і сямейным святам. Беларусы не толькі 9 мая аддаюць даніну павагі тым, каму абавязаны мірным небам і незалежнасцю. Мы імкнёмся захоўваць памяць пра тых, хто не прыйшоў з вайны...



Адной з галоўных задач мясцовай улады віцебскі губернатар назваў клопат пра ветэранаў. Вельмі важна таксама праз 70 з лішнім гадоў пасля Перамогі ўсталяваць як мага больш імёнаў загінулых. На жаль, прозвішчы большасці з 395 тысяч вызваліцеляў Віцебшчыны, якія засталіся ляжаць у гэтай зямлі назаўсёды, не вядомы. Таму пошукавая дзейнасць будзе працягвацца і пашырацца. На тэрыторыі мемарыялаў з'явяцца новыя таблічкі з імёнамі салдат і афіцэраў....

З удзелам кіраўніцтва вобласці ў Дзень Перамогі адбыліся святочнае шэсце ад плошчы Леніна да плошчы Перамогі і мітынг. Адказныя асобы, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый ускладі вянкі і кветкі да манумента воінам-вызваліцелям і падпольшчыкам. Для ветэранаў віцябляне наладзілі парад: перад імі прайшлі маршам каробкі Віцебскага кадэцкага корпуса, воінскіх падраздзяленняў, упершыню на парадзе сваю каробку выставіла ўпраўленне Следчага камітэта па Віцебскай вобласці.

Тысячы гараджан і гасцей горада сталі гледачамі святочнай канцэртнай праграмы «Дзякуй героям за мірнае неба!». Паслухалі мелодыі ў выкананні духавых аркестраў. Усе ахвотныя бралі ўдзел у спартыўных гульнях, конкурсах. Правялі спартыўную патрыятычную акцыю. Прыемным сюрпрызам стала дэманстрацыя абмундзіравання і ўніформы салдат і афіцэраў Чырвонай Арміі ваенных гадоў. 9 мая адбыўся канцэрт «Песні Перамогі». Прыгожым апошнім акордам святкавання стаў салют.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

# НА ЗЯМЛІ ЛЕГЕНДАРНАЙ КРЭПАСЦІ

З самага ранку ў Брэсцкую крэпасць пацягнуліся людскія рэкі. Прадстаўнікі грамадскасці, працоўных калектываў, навучальных устаноў, воіны брэсцкага гарнізона, проста гараджане і госці горада па традыцыі ідуць у крэпасць 9 мая, каб аддаць даніну павагі продкам, якія паклалі першы камень у падмурак Перамогі.


Ветэраны Вялікай Айчыннай вайны Мікалай БАНЧАНКА і Пётр КАЛПАКОЎ.

Калона ўдзельнікаў патрыятычнай акцыі «Беларусь памятае», або «Бессмяротны полк», сёлета налічвала некалькі тысяч чалавек. Напярэдадні з кіраўніцтвам ваенна-гістарычнага клуба «Гарнізон» — арганізатара акцыі — на сувязь выйшлі ініцыятыўныя групы з гарадоў Украіны, Калінінградскай вобласці, Масквы, Санкт-Пецярбурга, а таксама з Польшчы. Усе яны захацелі з партрэтамі сваякоў-франтавікоў урачыстым маршам прайсці мемарыял у Брэсцкую крэпасць. З кожным годам удзельнікаў гэтага памятнага шэсця становіцца больш. Сёлета да іх далучыліся музыканты, якія па ходзе выконвалі знаёмыя ўсім франтавыя песні.

На плошчы Цырыманіялаў адбыўся ўрачыста-жалобны мітынг. «На легендарнай зямлі Брэсцкай крэпасці мы адчуваем асаблівую адказнасць за тое, каб напоўніць ідэалы вялікай Перамогі рэальнымі справамі, стваральнай працай і развіццём», — адзначыў у сваёй прамове **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль ЛІС**.

Пасля мітынгу ў крэпасці прайшлі канцэрты творчых калектываў Брэстчыны, а таксама канцэрт кадэтаў Пермскага кадэцкага корпуса Прыволжскай федэральнай акругі Расійскай Федэрацыі. Святкаванне працягвалася ў парках і на іншых пляцоўках горада.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

# ПРЫМНАЖАЕМ СПАДЧЫНУ

Здаецца, у горадзе над Сожам не засталося месца, куды б не прыйшло свята Перамогі. Выстаўка ваеннай тэхнікі, конкурсы патрыятычнай песні, кінапаказы, канцэртныя праграмы, урачыстае адкрыццё «Фантана Перамогі» і нават спектакль заслужанага артыста Расійскай Федэрацыі Максіма Аверына... Усё гэта — Гомель у дзень Перамогі. Не абышлося без традыцыйнай салдацкай кашы і маладзёжнай акцыі «Гомель памятае», калі на Алеі Герояў заззялі сотні лампадак у памяць аб тых, хто некалі адстаяў мір на нашай зямлі.


Мікалай МАЛАНЧАНКА з унучкай Валерыяй.

Дарэчы, мерапрыемствы, прысвечаныя 72-й гадавіне Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, на Гомельшчыне праходзяць з самага пачатку мая. У гэтыя дні многіх вучняў гомельскіх школ прынялі ў рады Беларускай рэспубліканскай піянерскай арганізацыі.

У цэнтры горада 9 мая адбыўся Парад пераможцаў з удзелам ветэранаў, кіраўніцтва вобласці і горада, спартсменаў, творчай моладзі. Шэсце завяршылася мітынгам і ўскладаннем кветак да брацкай магілы савецкіх воінаў і падпольшчыкаў.

Сёння ў Гомельскай вобласці пражываюць 1 617 ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Прыняўшы эстафету ў бацькоў і дзядоў, цяперашняя маладая людзі абавязаны захаваць і прымнажыць атрыманую спадчыну, а дзень Перамогі дае магчымасць падтрымліваць гэту пераемнасць пакаленняў, адзначыў **старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір ДВОРНІК**:

— Мы павінны таксама зрабіць усё, што ад нас залежыць, каб не толькі ў нашай памяці, але ў сэрцах нашых унукаў і праўнукаў Дзень Перамогі навечна замацаваўся як дзень, які прынёс на гэту зямлю мір, свабоду і незалежнасць, чыстае неба і магчымасць працаваць для Радзімы.

У Ветцы ў гарадскім парку адбылося ўрачыстае адкрыццё Алеі Герояў. На ёй усталявана 12 памятных знакаў з імёнамі выхадцаў Веткаўшчыны, якія вызначыліся на палях Вялікай Айчыннай вайны.

На ўвекавечанне абаронцаў Айчыны і захаванне памяці пра ахвяр вайны толькі летась з абласнога бюджэту вылучана больш за 95 тысяч рублёў, яшчэ амаль 205 тыс. было зароблена на гэтыя мэты на рэспубліканскім суботніку.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

**Фотаздымкі БЕЛТА.**

# БЫЎ МЕСЯЦ МАЙ

На мемарыяльным комплексе «Курган Славы» ў Смалявіцкім раёне прайшлі галоўныя ўрачыстасці Міншчыны, прымеркаваныя да Дня Перамогі. Сюды прыбылі **старшыня Мінаблвыканкама Сямён ШАПІРА**, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, кіраўнікі раёнаў і горада Жодзіна, дэпутаты, прадстаўнікі грамадскасці. Старшыня аблвыканкама і ганаровыя госці ўсклалі кветкі да падножжа манумента.

Падчас мерапрыемства працавала тэматычная пляцоўка, на ёй выступілі з канцэртнай праграмай «Быў месяц май» аматарскія калектывы Міншчыны і асобныя выканаўцы. Прыхільнікі спорту паказалі сваё майстэрства ў дартсе, забіванні мяча ў вароты, фігурным кіраванні веласіпедам. У фотазоне «Салдацкі прывал» адбылася тэатралізаваная праграма з удзелам заслужанага аматарскага калектыву Беларусі драматычнага тэатра «Відарыс» імя М. Горкага з Барысава, народнага клуба самадзейных паэтаў і кампазітараў «Жывіца» Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці, народнага аматарскага аб'яднання «У коле сяброў» Жодзінскага гарадскога Дома культуры.

На газонах быў разгорнуты выязны гандаль, палявая кухня, дзе можна было пачаставацца салдацкай кашай.

Святочныя мерапрыемствы, мітынгі, выстаўкі былі зладжаны таксама ва ўсіх раёнах Міншчыны. Школьнікі, прадстаўнікі прадпрыемстваў, арганізацый павіншавалі ветэранаў, уручылі ім сувеніры. Тых, хто па стане здароўя не змог паўдзельнічаць у свяце, наведалі дома. У васьмі райцэнтрах наладзілі салют: Смалявічах, Чэрвені, Уздзе, Салігорску, Любані, Крупках, Лагойску, Капылі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

# ДЗЕ БУДЗЕ МУЗЕЙ ДЗЯДЗЬКІ КОСЦІ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Алег СМІРНОЎСКІ.



Аксана СМАРГОВА.



Анжаліка ЯНКОЎСКАЯ.



Ірына ЗАСЛОНАВА.

## Галоўнае — захаваць

**— Дзе быць музею: каля чыгуначнага вакзала, дзе ён знаходзіўся больш як 60 гадоў, або ў іншым месцы?**

**Алег Смірноўскі:** — Сітуацыя, якая склалася вакол Мемарыяльнага музея Героя Савецкага Саюза Канстанціна Заслонава, хвалюе не толькі ўладу, але і грамадскасць Оршы, у тым ліку ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Будынак, дзе з 1952-га змяшчалася экспазіцыя, меў больш чым стагадовую гісторыю. Калісьці ён знаходзіўся на балансе Беларускай чыгункі, але, і перадаўшы будынак ва ўласнасць горада, чыгуначнікі рэгулярна падтрымлівалі яго праз вылучэнне сродкаў на касметычны рамонт.

Для мяне асабіста музей Канстанціна Заслонава — тое месца, дзе мяне прымалі ў камсамол. На жаль, прырода ўмяшалася, і сёння мы не маем будынка. Пасля таго, як адбылося няшчасце, прымаць рашэнне трэба было аператыўна. Ратаваць макеты зброі, асабістыя рэчы Канстанціна Заслонава — тыя экспанаты, якім нельга знайсці замену, таму вырашылі музей тэрмінова эвакуіраваць. Работа не спынялася да таго часу, пакуль адтуль не быў вывезены апошні экспанат.

**Анжаліка Янкоўская:** — Тым не менш сёння музей існуе. Знішчаны толькі будынак. Ажыццяўляе сваю дзейнасць калектыў музейных работнікаў, захаваны фонд, створана экспазіцыя, хоць яна і змешчана цяпер на меншай плошчы.

**Алег Смірноўскі:** — Каб прыняць рашэнне для далейшага вызначэння — рамантаваць або зносіць будынак, мы запрасілі прадпрыемства «Салюс» з Наваполацка правесці спецыяльнае даследаванне. Згодна з заключэннем, з-за вялікіх разбурэнні будынак рамонту не падлягаў, а знаходжанне ў памяшканнях людзей катэгарычна забаранялася. Музей быў знесены. Але для таго каб захаваць памяць аб Героі Савецкага Саюза (а Орша ў многіх асацыіруецца не толькі з «Кацюшамі», а і з Заслонавым), экспазіцыю часова перанеслі ў адну з залаў Музея гісторыі і культуры горада Оршы.

Цяпер разглядаюцца розныя варыянты яе размяшчэння на пастаяннай аснове. Калі будзе прынята рашэнне аб будаўніцтве асобнага музейнага будынка, напэўна, не вельмі правільна ўзводзіць музей далёка ад чыгуначнага вакзала: жыццё і дзейнасць Канстанціна Заслонава напрамую звязана з чыгункай. Не будзем забывацца, што Орша — адзін з найбуйнейшых чыгуначных вузлоў Беларусі, і калі ён асацыіруецца з імем Заслонава, то пазбаўляцца памяці аб гэтым чалавеку няправільна. Тым больш, астанкі Героя Савецкага Саюза перапахаваны менавіта на станцыі Орша-Цэнтральная.

**Аксана Смаргова:** — Беларуская чыгунка на самым высокім узроўні шануе памяць аб Канстанціне Заслонаве. Гэта гераічны, вялікі чалавек. Імем Канстанціна Заслонава названа лакаматыўнае дэпо Орша, чыгуначная станцыя, дзіцячая чыгунка. Людзі, якія прыходзяць да нас на працу, ведаюць гісторыю Беларускай чыгункі, яе герояў. Мінскае аддзяленне, кіраўніцтва Беларускай чыгункі падтрымаюць усе пачынанні, звязаныя з аднаўленнем музея. Мы за тое, каб музей быў, каб памяць аб Канстанціне Заслонаве захоўвалася і надалей. Адназначна, ён павінен знаходзіцца ў крокавай даступнасці ад месцаў масавага наведвання людзей. А ўсё таму, каб як мага больш людзей ведала сваю гісторыю. І гэта датычыцца не толькі жыхароў Оршы, але і тых, хто бывае там праездам.

**Алег Смірноўскі:** — Ёсць і такая ідэя, якая, магчыма, не зусім адпавядае ўсім нормам музеефікацыі. Узяць сапраўдны паравоз (думаю, ва ўласнасці Беларускай чыгункі яны яшчэ ёсць), пасажырскі вагон, цяплушку і, адпаведна прыстасаваўшы, размясціць у іх экспазіцыю. Падобнага музея на тэрыторыі Беларусі няма, і я не ведаю, ці ёсць такі ўвогуле ў свеце. Калі «Аўрора» можа быць музеем, падводная лодка ў Маскве таксама выконвае функцыю музея, то чаму б і не? Я думаю, Беларуская чыгунка аказала б садзейнічанне і прадаставіла вагоны, якія не адпавядаюць сёння хадавым якасцям.

**Анжаліка Янкоўская:** — Музей у першую чаргу павінен забяспечыць захаванасць культурных каштоўнасцяў, музейных прадметаў, якія ўключаны ў асноўны фонд. Таму выклікае сумненне магчымасць размясціць экспазіцыю ў вагонах. Улічваючы, што ў фондах музея знаходзяцца і мемарыяльныя рэчы, прадметы побыту, а не толькі дакументы і матэрыялы, звязаныя з партызанскай дзейнасцю, мне здаецца, што больш правільна, каб музейныя прадметы знаходзіліся ў будынку або ў асобным памяшканні. Музеефікацыя вагонаў таксама мае права на існаванне, але не для стварэння мемарыяльнага музея Канстанціна Сяргеевіча Заслонава. Як адзін з аб'ектаў музея — магчыма, але не ў якасці памяшкання для размяшчэння пастаяннай экспазіцыі.

**Алег Смірноўскі:** — Безумоўна, у такім выпадку экспазіцыя павінна быць размешчана па ўсіх правілах, як таго патрабуюць законы музейнай справы.

**Анжаліка Янкоўская:** — Практыка стварэння экспазіцый у вагонах, паўпрычэпах існуе. Падобны праект прапрацоўваецца ў Вілейскім раёне: праектуецца эшалон, прысвечаны падзеям Першай сусветнай вайны на Вілейшчыне. Але, наколькі мне вядома, там не плануецца размяшчэнне музейных прадметаў асноўнага фонду, а будуць прадстаўлены толькі капійныя матэрыялы, муляжы, макеты, якія не патрабуюць захавання адпаведнага тэмпературна-вільготнаснага рэжыму, страта якіх узнаўляльная. Летась Беларускім дзяржаўным музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны быў створаны мабільны музей, але захоўванне музейных прадметаў на пастаяннай аснове там не прадугледжана.

**Ірына Заслонава:** — Гэты чалавек зрабіў настолькі шмат для Беларусі, што варты таго, каб яго жыццё і дзейнасць былі прадстаўлены менавіта ў асобным будынку. Жыхары Оршы, турысты добра ведаюць, што такі музей існаваў першапачаткова. У перапынках паміж перасадкамі або ў чаканні свайго цягніка яны з задавальненнем праводзілі час за праглядам экспазіцыі. І раптам усё знікла, кудысьці трэба ісці і дзесьці штосьці шукаць. Ды і ці ведаюць яны, дзе цяпер знаходзіцца экспазіцыя?

**Алег Смірноўскі:** — Даведацца, што музей не разбурылі, а экспазіцыя перанесена ў іншае месца, можна ў Доме культуры чыгуначнікаў, які знаходзіцца за 25 метраў ад будынка былога музея. Інфармацыя пра новае месцазнаходжанне экспазіцыі ёсць і на сайце Аршанскага райвыканкама, Музейнага комплексу гісторыі і культуры Аршаншчыны.

## Шырокая сфера дзейнасці музея павялічыць колькасць наведвальнікаў

**— Ці прадугледжана змена канцэпцыі Мемарыяльнага музея Заслонава?**

**Алег Смірноўскі:** — Калі, згодна з прынятым рашэннем, музей размесціцца ў цэнтры горада — па вуліцы Міра, 6, — хутчэй за ўсё, гэта будзе Ваенна-гістарычны музей або музей абаронцаў Айчыны імя Канстанціна Заслонава. Войнаў, якія прайшлі праз Аршаншчыну, было нямала, таму расказаць нам ёсць пра што. Але, нават калі зменіцца канцэпцыя музея, у любым выпадку ён будзе насіць імя Героя Савецкага Саюза.

**Ірына Заслонава:** — Магчыма, музей ужо не вернецца на ранейшае месца, але, на мой погляд, ён павінен быць каля чыгуначнага вакзала. Няхай гэта будзе нават самы маленькі будынак, але важна, каб ён быў самастойным.

**Анжаліка Янкоўская:** — Вядома ж, існуе практыка размяшчэння мемарыяльных экспазіцый у музеях больш шырокага профілю. Яскравы прыклад — Магілёўскі абласны мастацкі музей імя Паўла Масленікава. У адным будынку размяшчаецца экспазіцыя, прысвечаная непасрэдна жыццю і творчасці народнага мастака, дастаткова тут плошчы і для прадстаўлення іншых калекцый і экспазіцый музея. У выставачных памяшканнях праводзяцца зменныя выстаўкі. Чым большая плошча вылучана для работы музея, тым большая магчымасць правядзення шматлікіх культурных мерапрыемстваў, а значыць прыцягнення шырэйшых слаёў насельніцтва. Таму трэба добра ўзважыць: невялікі, але асобны будынак альбо вялікае памяшканне, дзе будуць суіснаваць побач і іншыя экспазіцыі, канферэнц-залы, выставачныя пляцоўкі. Гэта заўжды ідзе на карысць музею: чым шырэйшая яго сфера дзейнасці, тым вышэйшы інтарэс да музея ў насельніцтва. Таму настойваць, каб музей з'явіўся менавіта на тым месцы, дзе ён быў, напэўна, не зусім правільна. Іншая справа, калі на балансе раёна ёсць адпаведны будынак, які знаходзіцца непадалёк ад вакзала.

**Алег Смірноўскі:** — Раней тое, што знаходзілася ў раёне вакзала, адносілася да Беларускай чыгункі: пачынаючы ад камунальнай уласнасці, заканчваючы жылым фондам. Паступова нешта перадаецца гораду, але ў асноўным гэта датычыцца жылога фонду. Прыстасаваць музей у жылым доме — не самы лепшы варыянт: у кагосьці заліло, у іншага непаладкі з электрычнасцю. І гэта ўсё не на карысць экспанатам!

Размясціць экспазіцыю ў тым жа Доме культуры чыгуначнікаў, дзе, дарэчы, яна першапачаткова знаходзілася (з 1948 па 1952 год. — **Аўт.**), таксама няправільна. Адкрыць музей у школе? Па-першае, у адной са школ ёсць музей ваеннай гісторыі, дзе асобны блок прысвечаны Канстанціну Заслонаву. Па-другое, школьны музей не можа быць мемарыяльным. Ёсць праект музея Заслонава аршанскага архітэктара М. А. Сморчака, але па сённяшніх мерках, гэта трэцяя частка Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, таму ўзводзіць трохпавярховы будынак не зусім правільна. Мы разумеем, дзе б мы ні рабілі музей, у любым выпадку на гэта неабходны немалыя сродкі, але ўсё-такі музей павінен быць у раёне чыгуначнага вакзала.

**Аксана Смаргова:** — Трэба яшчэ ўлічваць і такі факт, што чыгунка — гэта зона павышанай небяспекі. Мы не можам дапусціць, каб пасажыры хадзілі па чыгуначных шляхах. Таму калі музей будзе размешчаны на тэрыторыі дэпо, доступ да яго будзе абмежаваны.

**Ірына Заслонава:** — Усё зводзіцца да таго, каб на тым жа месцы або побач музей быў узведзены наноў. Цяпер трэба думаць пра тое, як пабудаваць будынак, а потым ужо казаць пра канцэпцыю экспазіцыі. Асноўнае пытанне — быць або не быць музею самастойным. На мой погляд, калі ўжо і ўкладаць сродкі, то на пабудову новага будынка, а не на мадэрнізацыю старога.

**Алег Смірноўскі:** — Адназначна, калі рабіць, то рабіць добра і якасна. Калі і ствараць музей ва ўжо існуючым будынку, то гэта ў любым выпадку будзе не прыстасаванне, а рэканструкцыя. І такія прыклады ў раёне ёсць. Аршанскі музей Уладзіміра Караткевіча сёння размешчаны ў тым будынку, дзе раней быў радзільны дом, у якім вядомы пісьменнік з'явіўся на свет. Сёння гэта сучасны музей, які карыстаецца папулярнасцю як у жыхароў, так і ў гасцей Аршаншчыны.

## Жывём, пакуль памятаем

**— Захаванне гістарычнай памяці аб героях Вялікай Айчыннай: новыя падыходы альбо прыхільнасць традыцыям?**

**Аксана Смаргова:** — На базе лакаматыўнага дэпо Орша ёсць музей рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы — адным словам, народны музей. У трох залах змяшчаюцца экспазіцыі, прысвечаныя Канстанціну Заслонаву: схема маршруту па мясцінах баёў заслонаўцаў, фотаздымкі, вітражы развіцця будаўніцтва дэпо з адлюстраваннем помніка Заслонаву, аповед пра прафтэхшколу ў Вялікіх Луках, дзе вучыўся будучы герой... Музей наведваюць школьнікі горада, асаблівыя ўрачыстасці адбываюцца каля помніка-магілы партызанскага камандзіра на чыгуначным вакзале падчас 9 мая і 3 ліпеня. Гэта тыя мясціны, якія найбольш шануюць чыгуначнікі.

**Алег Смірноўскі:** — Для таго каб музей Заслонава, як і любы іншы музей, наведвала маладое пакаленне, сёння ўжо недастаткова расказваць гісторыю праз пэўныя экспанаты, як гэта было раней. Галоўнае — праз экспазіцыю дамагчыся таго, каб маладога чалавека, які зайшоў у музей, ахопліваў бы гонар за пакаленне людзей, якія адстаялі для нас Перамогу, мірнае неба над нашымі галовамі. Значнасць Перамогі сёння нельга пераацаніць, і, прыйшоўшы ў музей Канстанціна Заслонава, чалавек павінен гэта разумець.

Калі ў Оршу прыязджаюць дэлегацыі з розных краін свету, мы абавязкова імкнёмся ўключыць у іх камандзіроўку наведванне мясцін або ўстаноў, звязаных з мемарыялізацыяй памяці аб Вялікай Айчыннай вайне. І людзі, пабачыўшы гэта, разумеюць, чаму для беларусаў важная памяць аб тых трагічных і разам з тым гераічных падзеях. Яны ўражаны тым, як мы шануем людзей, якія здабывалі Перамогу: ці гэта франтавікі, ці партызаны, ці тыя, хто шмат працаваў у тыле. Таму не трэба прыдумляць новых падыходаў, у нас усё гэта ёсць.

**Ірына Заслонава:** — Супрацоўнікі музея Заслонава ў свой час настолькі добра папрацавалі, сабраўшы вялізны матэрыял аб усіх атрадах і брыгадах, якія ў гады Вялікай Айчыннай дзейнічалі на Аршаншчыне. Дзякуючы ім, не ўпушчана ні адно прозвішча, ні адна дэталь. На жаль, з кожным годам бацьку ўспамінаюць усё менш. Пра яго напісана пяць кніг. І кожны пісаў тое, на што здольны. Я аб'ездзіла многія архівы былога Савецкага Саюза і выдала кнігу, заснаваную на дакументальным матэрыяле. Можна было б яе перавыдаць і ўсе атрыманыя за яе сродкі накіраваць на будаўніцтва новага музея.

**Аксана Смаргова:** — Сёння мала паказаць экспазіцыю, трэба яшчэ і зацікавіць наведвальніка, каб ён зноў вярнуўся. Сучасны музей павінен спалучаць у сабе гістарычную памяць з найноўшымі тэндэнцыямі ў справе музеефікацыі. Перш за ўсё мы ствараем гэта для дзяцей, для будучых пакаленняў: мы жывыя, пакуль жыве памяць аб подзвігах нашых вялікіх продкаў. Сённяшнім музеям не хапае інтэрактыўнасці. Добрым прыкладам сучаснага аснашчэння экспазіцыі можа стаць новы музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

**Анжаліка Янкоўская:** — Сучасныя тэхналогіі, падыходы ў пабудове экспазіцыі даюць вельмі добрую магчымасць забеспячэння доступу наведвальнікаў да інфармацыі, дакументаў, якія не прадстаўлены шырока. Пры стварэнні новых экспазіцый выкарыстоўваюцца інфакіёскі, шматлікія плазменныя і інтэрактыўныя панэлі. Дзякуючы сучасным тэхналогіям, наведвальнікі могуць самастойна пазнаёміцца з гісторыяй музейнага прадмета. Гэта толькі на карысць як фондавай, так і культурна-адукацыйнай рабоце. Таму чым большая плошча будзе выдзелена для музея Канстанціна Заслонава, яго экспазіцыі і фондасховішча, тым больш усё гэта пойдзе на карысць развіццю ўстановы.

**Алег Смірноўскі:** — Ці будуем мы новы будынак, ці адраджаем стары — у любым выпадку гэта павінна быць рэспубліканская праграма. Мы разумеем, што раённы бюджэт і нават абласны не пацягне патрэбныя выдаткі. Спадзяёмся, што Міністэрства культуры Беларусі ўключыць гэты аб'ект у пэўную праграму, каб на будучы Мемарыяльны музей Героя Савецкага Саюза Канстанціна Заслонава ішло мэтавае фінансаванне. Заўсёды ў складаных сітуацыях падстаўляе нам плячо і Беларуская чыгунка. Сёння трэба закасаць рукавы і ўсёй талакой адраджаць музей!

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

10 мая 2017 г.
№16 (400)




стар. 3

**Чаго не хапае вясковай культуры?**



стар. 5

**Каго падвезці да паліклінікі?**



стар. 6

**Прадпрымальніцтва з сацыяльнай адказнасцю**

ГАЛОЎНАЯ ТЭМА

# ДАРОГУ ПРЫВАТНІКУ

## Дзяржава хоча стварыць канкурэнцыю ў сферы сацыяльных паслуг



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Алеся ХВАШЧЭЎСКАЯ — дырэктар тэрытарыяльнага Цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ушацкага раёна — наведвае пенсіянерку Ганну ШЧЭРБІК, якой сёлета споўніцца дзевяноста тры гады. Доўгажыхарка жыве ва Ушачах.

**Амаль кожны пяты беларус дасягнуў узросту 60 гадоў і больш, практычна кожны дваццаты мае інваліднасць. У выніку павялічваецца патрэба людзей у сацыяльных паслугах. Эксперты задаюцца пытаннем: як задаволіць попыт на сацыяльнае абслугоўванне, які ўзрастае, і адначасова павысіць эфектыўнасць фінансавых рэсурсаў, што выдзяляюцца грамадствам для забеспячэння належнага ўзроўню і якасці жыцця людзей?**

— Для гэтага неабходна, каб у аказанні сацыяльнай дапамогі не было манаполіі дзяржавы, — лічыць **намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Марыяна ШЧОТКІНА.** — Аказваць сацыяльныя паслугі, якія карыстаюцца попытам у спажыўцоў, могуць і павінны таксама і недзяржаўныя структуры: некамерцыйныя арганізацыі, прыватныя прадпрыемствы, індывідуальныя прадпрымальнікі — у рамках дзяржаўна-прыватнага партнёрства.

стар. 4–6

ЗДАРОЎЕ — У ПРЫЯРЫТЭЦЕ

# НЕ ТОЛЬКІ ДЛЯ ГОРАДА

**Наваполацкая цэнтральная гарадская бальніца ўжо сёлета будзе мець усё, што неабходна для аказання медыцынскай дапамогі на сучасным узроўні. Застаецца атрымаць камп'ютарны тамограф і ангіёграф. Памяшканні для ўстаноўкі новай тэхнікі гатовыя, спецыялісты падрыхтаваныя. Пацыенты — у чаканні, бо, вядома, у справе атрымання лячэбнай дапамогі адлегласць мае значэнне. Адна справа ехаць па высокія тэхналогіі ў Віцебск ці нават Мінск, і другая — мець усё, што называецца, пад рукой.**

Паслугамі бальніцы з 2013 года карыстаюцца не толькі жыхары самога Наваполацка, але і дзевяці навакольных раёнаў — многія з іх заўважаюць, што цяпер няма неабходнасці рвацца на абследаванне і лячэнне ў Віцебск ці сталіцу.

Мы з фотакарэспандэнтам вырашылі паглядзець у першую чаргу тое, у чым наваполацкая ўстанова аховы здароўя не саступае гарадскім бальніцам Мінска. Пачалі з асобнага корпуса радзільнага дома, які ў 2013-м быў пераасначаны. Тут чыста, прыгожа, па-сучаснаму, і без бахілаў ды халата не пройдзеш.

— Раней існавалі два аддзяленні на 60 ложкаў у Наваполацку і Полацку, а затым быў створаны адзіны перынатальны цэнтр, — тлумачыць **загадчыца радзільнага дома Маргарыта РАЗІНА.** — У Полацку засталася кансультацыйная дапамога, а ўсіх парадзіх з двух гарадоў — каля 2,6—2,8 тысячы ў год — прымаем тут. Акрамя таго, усе складаныя выпадкі з дзевяці тэрытарыяльна блізкіх раёнаў таксама накіроўваюцца да нас. Практыка паказвае, што якасць аказання дапамогі стала ў выніку лепшай. За 30—40 хвілін, максімум за адну гадзіну, можа даехаць любая парадзіха. І гэта норма для родаў. Даязджаюць нават тыя, каму патрабуецца экстранная дапамога. Урачы на прыёме ўсё тлумачаць жанчынам — калі трэба ехаць, чаму не варта ні ў якім разе нараджаць дома, каб не рызыкаваць жыццём і здароўем ні сваім, ні дзіцяці.

У акушэрскім корпусе бальніцы — пяць паверхаў, тут размяшчаюцца ўласна акушэрскія і гінекалагічнае аддзяленні, рэанімацыя на шэсць ложкаў. Раней спецыяльнай рэанімацыі для парадзіх не было, а цяпер урачы-рэаніматолагі праводзяць абязбольванне ў родах — па паказаннях і па жаданні, анестэзію падчас апаратыўных умяшанняў.

стар. 8



Фота Надзеі БУЖАН.

Новы палачанін нарадзіўся!

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# Адкрылі свята друку

*Старшыні пастаянных камісій Савета Рэспублікі ўзялі ўдзел у выстаўцы «СМІ ў Беларусі»*

**Ірына Старавойтава, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, і Сяргей Рахманаў, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, прынялі ўдзел у адкрыцці XXI Міжнароднай спецыялізаванай выстаўкі «СМІ ў Беларусі».**



Фота БЕЛТА.

Арганізатарамі выстаўкі выступілі Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, НВЦ «Белэкспа» пры падтрымцы Мінгарвыканкама, Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі, Саюза выдаўцоў і распаўсюджвальнікаў друку, Дома прэсы, Беларускага саюза журналістаў. На выстаўцы было прадстаўлена больш за 400 друкаваных СМІ, тэле- і радыёпраграм, каналаў з Беларусі, Кітая, Азербайджана, Балгарыі, Германіі, Грузіі, Індыі, Латвіі, Літвы, Расіі, Турцыі, Украіны.

# Вада жывая і мёртвая

*Законапраект, які датычыцца якасці пітной вады, дапрацуюць*

**На мінулым тыдні пад кіраўніцтвам старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандра Папкова прайшла нарада па абмеркаванні праекта Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы па пытаннях пітнога водазабеспячэння».**

У мерапрыемстве ўзялі ўдзел старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве Юрый Дарагакупец, міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі Аляксандр Церахаў, намеснік міністра аховы здароўя Беларусі — галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Беларусі Наталля Жукава.

Удзельнікі нарады абмеркавалі палажэнні законапраекта, якія датычацца забеспячэння насельніцтва пітной вадой, пытанні эксплуатацыі і ўтрымання ў належным стане сістэм пітнога водазабеспячэння, узмацнення ролі органаў дзяржаўнага кіравання па кантролі за якасцю вады, фарміравання фондаў для будаўніцтва, рамонту і эксплуатацыі існуючых сістэм водазабеспячэння, санітарна-эпідэміялагічнай бяспекі. Па выніках мерапрыемства прынята рашэнне аб істотнай дапрацоўцы законапраекта.

# Кожнаму — увага

*У верхняй палаце адбылася сустрэча з грамадзянамі*

**У Савеце Рэспублікі асабісты прыём грамадзян правяла старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Ала Бодак.**

У ходзе прыёму былі абмеркаваны пытанні, якія датычацца выканання заканадаўства ў сферы аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў. Па пастаўленых грамадзянамі пытаннях Ала Бодак дала неабходныя тлумачэнні і рэкамендацыі.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

БЛІЖЭЙ ДА ЛЮДЗЕЙ

# Галоўны паказчык — вырашаныя праблемы

## Падчас круглага стала яго ўдзельнікі абмеркавалі, якімі павінны быць дэпутаты мясцовых Саветаў

**Ці ведаеце вы свайго дэпутата і якія праблемы яму неабходна вырашаць? Менавіта пра гэта пацікавіліся журналісты ў жыхароў Мінска, Бабруйска і Гродна падчас адпаведнага відэа-апытання. Аказалася, што колькасць станоўчых адказаў невялікая. Людзі, якіх апытвалі, у пераважнай большасці сваіх дэпутатаў не ведаюць. Чаму так адбываецца і якім чынам можна змяніць сітуацыю? Пра гэта і разважалі ўдзельнікі круглага стала «Роля мясцовага самакіравання ў грамадскім і сацыяльна-эканамічным развіцці рэгіёна і краіны ў цэлым», які адбыўся ў межах выстаўкі «СМІ ў Беларусі».**

Ці дастаткова дэпутатам мясцовых саветаў тых кампетэнцый, што яны маюць на цяперашні момант? **Аляксандр ПАПКОЎ, старшыня Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі**, лічыць, што ўзровень мясцовага самакіравання трэба падымаць, каб праблемы людзей вырашаліся больш эфектыўна. «Менавіта дэпутаты фарміруюць бюджэт і зацвярджаюць яго. І даходную, і расходную часткі. Таму калі сёння ў чалавека няма магчымасці напіцца вады, нармальна пад'ехаць да дома, вырашыць пытанні бяспекі свайго дзіцяці, хто першым павінен падняць гэтую праблему на дзяржаўным узроўні і вырашыць яе? Вядома, дэпутат. Аб уладзе, аб дзяржаве, аб кіраванні на дзве трэція судзяць па тым, як вырашаюцца пытанні людзей на месцах», — сказаў Аляксандр Папкоў.

Па яго словах, раней, у савецкія часы, многія пытанні на сябе брала дзяржава. Цяпер мясцовае самакіраванне трэба падняць на такую вышыню, каб менавіта яно магло без перашкод вырашаць розныя сацыяльныя праблемы.

**Міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ** лічыць, што для асвятлення тэмы мясцовага самакіравання не дастаткова адной газеты «Звязда» і яе дадатка «Мясцовае самакіраванне». «Гэтая тэма павінна быць у цэнтры ўсіх грамадска-палітычных выданняў. На рускай мове, на беларускай мове, таму што гэтая тэма — усё тое, што звязана з жыццём людзей, — падкрэсліла Лілія Ананіч. — І я ўношу прапанову: давайце разам знойдзем такую форму, паглядзім на прыкладзе самых лепшых рэгіёнаў, як працуе наша рэгіянальная прэса, якія ў яе дасягненні. Каб усё працавала эфектыўна, патрэбныя глыбокі аналіз і зацікаўленасць. Давайце падзелімся гэтым вопытам, каб сродкі масавай інфармацыі больш эфектыўна ўплывалі на рэалізацыю задач, якія сёння стаяць перад нашымі органамі ўлады».

Таксама міністр адзначыла, што для вырашэння пэўных праблем людзей існуюць канкрэтныя службы, аднак стаўленне да таго ці іншага пытання мясцовай улады павінна быць выразным і зразумелым. «Звярнуліся людзі — значыць, павінна быць так праведзена работа, каб чалавек не адчуў, што ён нецікавы», — падкрэсліла яна.

**Леанід ЦУПРЫК, старшыня Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі**, выказаў меркаванне, што сакрэт пазнавальнасці дэпутата — у выніковасці яго работы. На яго думку, дэпутат павінен быць вядомым сярод тых, хто яго абраў. Так, рэгулярна ў раённых газетах друкуюцца матэрыялы аб працы дэпутатаў, аб прамых лініях, аб прыёме грамадзян, якія яны праводзяць. Калі чалавек чытае гэты тэкст, то, напэўна ж, запамінае хоць бы прозвішча дэпутата. «Але ёсць адзін нюанс: чалавек не абавязаны чытаць усё, што яму прапануецца», — падкрэсліў Леанід Цупрык.

Галоўны сакрэт пазнавальнасці дэпутата, на думку парламентарыя, — гэта выніковасць яго дзейнасці. Галоўны вынік працы — вырашаныя праблемы выбаршчыкаў.

Думку, што галоўная задача дэпутата — працаваць на карысць грамадзян, пацвердзіла і **старшыня Жодзінскага гарадскога Савета дэпутатаў Наталля СУШКО**. «Ацэнку дэпутату павінен даваць выбаршчык, таму што людзі аддаюць свой голас за дэпутата, — адзначыла Наталля Міхайлаўна. — А што значыць «аддаць голас»? Гэта значыць, менавіта гэты чалавек з'яўляецца аўтарытэтным грамадзянінам і можа агучыць праблемы, зрабіць усё магчымае, каб іх вырашыць. У першую чаргу дэпутат павінен быць неабыякавым чалавекам, ён павінен навучыцца жыць праблемамі людзей свайго акругі, прапускаць іх праз сябе, перажываць іх так, як і яго выбаршчык».

Таксама старшыня Жодзінскага гарадскога Савета дэпутатаў дадала, што сёння людзі павінны ісці з праблемамі менавіта да дэпутатаў, а не кідацца адразу пісаць лісты ў спецыялізаваныя органы.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

***(Матэрыял з круглага стала чытайце ў наступным нумары «МС».)***

СЛОВА — ДЭПУТАТУ

# МЭТАНАКІРАВАНАЯ ПРАЦА ДАЕ НАЛЕЖНЫЯ ВЫНІКІ

**Народныя абраннікі дзеляцца меркаваннямі аб тым, як будуць вырашацца задачы, пастаўленыя кіраўніком дзяржавы падчас звароту да беларускага народу і Парламента.**

**Вольга ПАЛІЦЫКА, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі:**

— Для сябе я акрэсліла асноўнай тэмай Паслання Прэзідэнта нацыянальную бяспеку. Кожны з пунктаў, на якіх спыняўся Аляксандр Рыгоравіч, быў прысвечаны аднаму з яе аспектаў. Гэта эканамічная бяспека, сацыяльная, ваенная, навукова-тэхналагічная... Галоўны вынік, які неаднаразова паўтараў Прэзідэнт, — усё залежыць ад нас і ўсё ў нашых сілах. Калі мы прыкладзём сваю працу — і зробім гэта мэтанакіравана — у нас усё атрымаецца.

Працэс рэалізацыі Дэкрэта №3 — адзін з самых свежых і наглядных прыкладаў, які паказвае, як прыняцце нейкага рашэння, для якога не прадуманы эфектыўны механізм рэалізацыі, потым на месцах выліваецца ў канкрэтныя праблемы. Тут я б хацела сказаць — можа, гэта камень і ў наш агарод — роля дэпутатаў у тым і заключаецца, каб, працуючы над заканадаўчымі актамі, бачыць, як у тваёй акрузе будзе прыменены той ці іншы закон. І калі ты бачыш, што пры рэалізацыі нейкіх нарматыўных актаў ёсць праблемы на месцах, трэба сігналізаваць.

Для гэтага ў нас і праводзяцца ўрадавыя гадзіны, для гэтага мы надзелены паўнамоцтвамі, што называецца, без чэргаў заходзіць у любыя кабінеты і ставіць любыя пытанні. І, безумоўна, калі мы вернемся да папярэдняга працэсу аптымізацыі дзяржаўнага апарату, то трэба шчыра прызнаць, што атрымалася, на маю думку, некалькі перавернутая піраміда.

Больш скарацілася менавіта пярвічнае звяно, а не верхняе. Атрымалася, што міністэрстваў у нас шмат, а аддзелы ў выканкамах — аб'яднаны.

**Сяргей БОБРЫКАЎ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па нацыянальнай бяспецы:**

— Стабільнасць, суверэнітэт, незалежнасць — вельмі каштоўныя рэчы для дзяржавы, якія павінны быць забяспечаны. У нас добрыя напрацоўкі ёсць у гэтым кірунку. Наш спакой каштуе вельмі дорага, гэта трэба падтрымліваць і цаніць. Усе чамусьці лічаць, што ў нас дрэнная моладзь. Яна не дрэнная, яна некалькі іншая, проста мы сталі больш сталымі, і мы пачынаем не да канца іх разумець. Добрыя ў нас хлопцы. Яны ёсць і будуць — годныя абаронцы нашай Радзімы.

У нас дастаткова сіл і сродкаў для таго, каб захаваць свой суверэнітэт. Мы ўважліва адсочваем усе ваенныя навоўвядзенні, якія адбываюцца ў свеце і з улікам гэтага развіваем і свае Узброеныя Сілы. У галіне ваеннай сферы ў нас ёсць дамоўленасці з Расійскай Федэрацыяй і ў маштабе АДКБ. Мы штогод праводзім сумесныя мерапрыемствы, сёлета таксама будуць вучэнні, пра якія сказаў кіраўнік дзяржавы падчас Паслання.

У гэтым няма нічога незвычайнага, гэта ўсё на планавай аснове развіваецца паступова з улікам новых рызык і пагроз, якія існуюць у свеце.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

НА ДУМКУ ПАРЛАМЕНТАРЫЯ

# ЧАГО НЕ ХАПАЕ ВЯСКОВАЙ КУЛЬТУРЫ?

## Член Савета Рэспублікі Мікалай АЛДАНАЎ пра духоўнае адраджэнне малых населеных пунктаў

**Мікалай Міхайлавіч вядомая ў культурным асяродку асоба, ён — кіраўнік Магілёўскага філіяла (адзінага ў рэспубліцы!) Акадэміі музыкі, дырыжор аркестра народных інструментаў імя Л. Іванова, пастаянны ўдзельнік рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў і фестываляў. А з мінулага года яшчэ і сенатар, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці. Грамадскай справай захоплены не менш, чым музыкай. Са сваімі выбаршчыкамі заўсёды на прамой сувязі. Праз акаўнт у «Жывым Журнале» (ЖЖ) рэгулярна дае справаздачы і пра сваю творчасць, і пра дэпутацкія справы. Вельмі актыўна супрацоўнічае з сельскай інтэлігенцыяй. І нават паспеў знайсці аднадумцаў сярод тых, хто ўжо сёння дапамагае адраджаць жыццё на вёсцы.**



### СТАЎКА НА ІНТЭЛІГЕНЦЫЮ

Узяць, напрыклад, аграгарадок Аўсянка Горацкага раёна. Тутэйшая стараста Людміла Бандарэнка — інтэлігентка, прычым гарадскога паходжання. Усё жыццё працавала ў школе, нават была дырэктарам. Цяпер на пенсіі, але творчы запал не згубіла. На паўстаўкі працуе настаўніцай у мясцовым школе, а астатні час прысвячае грамадскім справам. У якасці старасты заахвочвае людзей на розныя сумесныя акцыі. Пра перавагі сельскага жыцця можа гадзінамі расказваць. Апошнія тры гады рэйтынг гэтага населенага пункта сярод моладзі толькі расце. Жыхароў тут менш за тысячу, але ўмовы набліжаныя да гарадскіх. Школа з басейнам і сучасным спартыўным комплексам, стадыён, дзе летам адбываецца шмат цікавых мерапрыемстваў. У Доме культуры працуюць гурткі па інтарэсах, тут жа — школа мастацтваў, музей. Пашыць модны касцюм або зрабіць прычоску можна ў Доме быту. А выбар прамысловых і прадуктовых тавараў у мясцовых крамах не горшы, чым у гарадскіх. Ёсць нават кавярня, якую адкрыў мясцовы прадпрымальнік. Умовы добрыя. Чаму не жыць?

***— А выпускнікі Акадэміі музыкі часта застаюцца на сяле?***

— Яны размяркоўваюцца па дзяржзапытах. Але, каб гэты спецыяліст прыжыўся, трэба спачатку забяспечыць яго жыллём, годнай зарплатай. Ён павінен зарабляць больш, чым у горадзе. Калі чалавеку далі жыллё, ён пачынае думаць пра стварэнне сям'і. Стварыў сям'ю, значыць пусціў карані. А калі ў яго цікавасці няма, то ён толькі і думае пра тое, куды б збегчы.

Людміла Бандарэнка лічыць, што замацаванне моладзі на сяле адбываецца ў тым ліку і дзякуючы правільнай палітыцы мясцовага кіраўніцтва. Для маладых і перспектыўных тут заўсёды знойдзецца жыллё і гарантаваны сацыяльны пакет. Дапамога, ільготы, пашана — усё гэта добра спрацоўвае, калі ёсць патрэба ў спецыялістах. А перавагі вёскі перад горадам відавочныя, лічыць стараста. Экалогія, прырода, добрая магчымасць праявіць сябе, рэалізаваць ідэі — што яшчэ чалавеку патрэбна? Ды і бізнес у вёсцы весці лягчэй. «Галоўнае — навічка на гэтым этапе падтрымаць, не расчараваць, — кажа стараста. — У 70-я гады ў Аўсянцы быў кіраўнік гаспадаркі, які даражыў кожным спецыялістам, выкарыстоўваў любыя метады, каб толькі чалавека зацікавіць. І гэта сябе апраўдвала».

> Сёння ёсць малыя населеныя пункты, адкуль людзі нізашто не паедуць у горад. Трэба паказваць гэты вопыт і абагульняць.

Ідэя Мікалая Алданава — рабіць стаўку на сельскую інтэлігенцыю — Людміле Бандарэнцы адразу ж спадабалася. Тутэйшыя, запэўнівае яна, з задавальненнем падтрымаюць гэты праект. Ініцыятыўныя людзі знойдуцца і ў суседніх населеных пунктах. «Горы, Сава, Маслакі, Леніна — сельскае жыццё там таксама б'е крыніцай», — кажа яна.

### ВОПЫТ РАСІЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ

На адраджэнне вёскі праз сельскую інтэлігенцыю Мікалая Алданава натхніў яго расійскі сябар, кіраўнік Дабрачыннага фонду адраджэння культуры і традыцый малых гарадоў Расіі народны артыст Уладзімір Маторын. Сёлета аркестр народных інструментаў імя Іванова на чале з Мікалаем Алданавым акампаніраваў знакамітаму басу Расіі на сцэне Крамлёўскага палаца з'ездаў. Дабрачынны канцэрт з цыкла «Шэдэўры рускай музыкі — малым гарадам і сёлам Русі» праходзіў у рамках фестывалю «Сафія-2017», які патрануе старшыня Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі Валянціна Мацвіенка.

— Напярэдадні канцэрта ў Савеце Федэрацыі адбылася сустрэча з сельскай інтэлігенцыяй. А гэта больш за 3 тысячы прадстаўнікоў малых населеных пунктаў са 150 абласцей Расіі, — расказвае дэпутат. — У іх была магчымасць агучыць свае праблемы ў прысутнасці Валянціны Мацвіенкі, міністраў культуры, адукацыі, сацыяльнай сферы, спорту і турызму. Размова ішла пра тое, чым сёння жыве вёска, што перашкаджае яе развіццю, якія формы працы ўжо аджылі свае і што трэба мяняць. Тэма вельмі актуальная і для нас. Я збіраюся агучыць яе на ўзроўні нашага Савета Рэспублікі. Папярэдняя размова ўжо ішла ў Міністэрстве культуры. Можна арганізаваць выязное пасяджэнне круглага стала з удзелам прадстаўнікоў усіх рэгіёнаў. Трэба прааналізаваць, што ў нас ёсць, і вырашыць, у якім кірунку развівацца.

### ГАЛОЎНАЕ — МАТЫВАЦЫЯ

Мікалай Алданаў успамінае, як шмат прыхільнікаў збірае душэўны Фестываль звону ў невялікім па колькасці жыхароў Хоцімску Магілёўскай вобласці. Аркестр — нязменны ўдзельнік гэтага фестывалю, тут яго любяць і чакаюць. Фестываль падтрымлівае вельмі паважаны ў Хоцімску чалавек, настаяцель Свята-Траецкага сабора Кірыл Бадзіч. Што перашкаджае іншым стварыць свае свята? Няўжо няма зацікаўленых у заханванні сваёй малой радзімы людзей?

— Калі кіраўнік нейкай вёскі або гаспадаркі пажадае, каб яго жыхары або работнікі далучыліся да мастацтва, я з задавальненнем прыму запрашэнне, — кажа Мікалай Міхайлавіч. — Восенню планую правесці мерапрыемства з удзелам прадстаўнікоў ад раёнаў, дзе можна было б абмеркаваць праблемы і даць канцэрт.



Мікалай АЛДАНАЎ са сваім аркестрам.

Уладзімір Маторын таксама гатовы мяне ў гэтым падтрымаць. Наша сяброўства, дарэчы, пачалося са свята ў Александрыі ў Шклоўскім раёне, дзе мы разам выступалі на Купаллі. З тых часоў наш аркестр часта акампануе расійскай зорцы на культурных мерапрыемствах то ў Беларусі, то ў Расіі. Напрыклад, гэта было на Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі ў Магілёве.

***— Ідэя з адраджэннем вёскі вельмі добрая і патрэбная, але ж як вы збіраецеся рэалізаваць свой праект?*** — пацікавіліся мы ў маэстра.

— Я абсалютны рэаліст, сам вырас у вёсцы. Калісьці яна таксама была моцная, а зараз апынулася сярод неперспектыўных. Але значная частка беларусаў і сёння працягвае жыць на вёсцы. І стварэнне для іх камфортных умоў — адна з прыярытэтных дзяржаўных задач. Па сваім вопыце ведаю, якое значэнне мае матывацыя. Вельмі важна паказаць чалавеку станоўчыя прыклады. Сёння ёсць малыя населеныя пункты, адкуль людзі нізашто не паедуць у горад. Трэба паказваць гэты вопыт і абагульняць. Тыя ж дыскатэкі, якія калісьці былі актуальныя, цяпер не прадстаўляюць цікавасці. Абрады, традыцыі, рэлігія — вось на што цяпер робіцца акцэнт. Трэба сабраць прадстаўнікоў сельскай інтэлігенцыі з усёй рэспублікі і паказаць ім прыклады самага лепшага, што ёсць у Беларусі.

> Дапамога, ільготы, пашана — усё гэта добра спрацоўвае, калі ёсць патрэба ў спецыялістах.

***— А як можа паўплываць інтэлігенцыя на тых, каго больш цікавіць, дзе б выпіць ды што скрасці?***

— Працэс перавыхавання не імгненны, нават доўгі. Справа гэта няпростая — каб змяніць свядомасць, патрэбны час. Мы павінны стварыць умовы. Вось чаму цяпер у горадзе практычна не сустрэнеш брудных машын? Людзям сорамна. Вуліца чыстая, і ты адчуваеш няёмкасць. Таксама і на вёсцы. Калі каля дома суседа чысціня і парадак, чалавек стварае і ў сябе прыгажосць, каб не быць горшым. Усё, паўтаруся, залежыць ад ініцыятыўных людзей. Трэба аб'яднаць, запаліць, накіраваць і падтрымаць. Дзяржава таксама не павінна аставацца ў баку. Інакш людзі проста не будуць заставацца. Узяць тую ж Аўсянку. Там сапраўды ёсць усё — Дом быту, розныя крамы, клуб, жыллё для маладых спецыялістаў... Вось у мяне ёсць кватэра ў горадзе, але я сабе больш камфортна адчуваю на дачы, што за 13 кіламетраў ад Магілёва. Я нешта там раблю, майструю, жонка займаецца зямлёй, і мы абодва шчаслівыя. Але я вяртаюся ў горад, таму што тут працую. А калі б асноўная работа ў мяне была там, а разам з ёй жыллё, інфраструктура, я і не думаў бы вяртацца. Мы павінны стварыць на сяле такія ўмовы, каб самім захацелася там застацца.

Я быў бы рады пачуць ад жыхароў краіны, што яны думаюць з гэтай нагоды. Што нам перашкаджае адрадзіць культурнае жыццё ў невялікіх населеных пунктах? Мы можам працягнуць размову на старонках «Жывога Журнала» (*http://n-aldanov.livejournal.com*). Абяцаю, што слушныя прапановы будуць агучаны ў парламенце.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** zigulya@zviazda.by

# ДАРОГУ ПРЫВАТНІКУ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)***

Сёння, дарэчы, гэта адзін з ключавых трэндаў ва ўсім свеце. У Францыі ці, напрыклад, Італіі каля паловы стацыянарных паслуг для пажылых людзей аказваюць прыватныя кампаніі, у Германіі — амаль 90%. Эксперты бачаць у гэтым шлях да скарачэння выдаткаў і росту эфектыўнасці, бо ***падобная сістэма стварае канкурэнцыю на рынку сацыяльных паслуг, пры гэтым самі яны становяцца больш разнастайнымі і якаснымі***.

У Беларусі сацыяльнае абслугоўванне даступна для любога, хто мае ў ім патрэбу, лічыць Марыяна Шчоткіна, маючы на ўвазе не толькі даступнасць установаў, якія аказваюць такія паслугі, але і яшчэ адзін істотны момант — нізкі кошт сацыяльных паслуг у нашай краіне.

Цяпер нашай асноўнай задачай, на думку намесніка старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага Сходу, з'яўляецца стварэнне канкурэнтнага рынку сацыяльных паслуг, каб чалавек мог сам выбраць арганізацыю, якая будзе забяспечваць яму той ці іншы від абслугоўвання.

У нашай краіне з 2013 года дзейнічае новая рэдакцыя закона «Аб сацыяльным абслугоўванні», якой прадугледжаны механізм прыцягнення юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў да аказання сацыяльных паслуг і рэалізацыі сацыяльных праектаў. Гэта дзяржаўны сацыяльны заказ, дзякуючы якому некамерцыйныя арганізацыі могуць прэтэндаваць на субсідыі дзяржавы ў гэтай сферы. Памер такіх субсідый можа дасягаць 50% ад кошту праекта.

Дарэчы, Марыяна Шчоткіна падчас кіравання Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны была «правадніком» гэтай новай для Беларусі ідэі. Прычым яна лічыць, што ў ідэале ў якасці сацыяльнага заказу павінны аказвацца ў першую чаргу тыя віды паслуг, якія альбо зусім не забяспечваюцца дзяржаўнымі ўстановамі сацыяльнага абслугоўвання, альбо аказваюцца імі не ў поўным аб'ёме. Да такіх адносяцца, напрыклад, паслугі хоспіса для безнадзейна хворых, сацыяльна-бытавая дапамога псіхічна хворым, медыка-сацыяльная дапамога ў дамашніх умовах (масаж, перавязкі, лячэнне пролежняў, вымярэнне ўзроўню цукру ў крыві, ціску і інш.), няні для шматдзетных сем'яў, рэабілітацыйныя паслугі тым, хто пакутуе ад наркатычнай і алкагольнай залежнасці, і іншыя.

* * *

Зараз дзяржаўны сацыяльны заказ уведзены ў практыку работы мясцовых органаў улады, а Дзяржаўнай праграмай аб сацыяльнай абароне і садзейнічанні занятасці насельніцтва на 2016—2020 гады прадугледжана выдача субсідый недзяржаўным некамерцыйным арганізацыям на аказанне сацыяльных паслуг і рэалізацыю сацыяльных праектаў з фінансаваннем за кошт мясцовых бюджэтаў. Фінансаванне пад гэта прадугледжана ў кожнай вобласці і ў Мінску. Тым не менш да гэтага часу ў сферы сацыяльнага абслугоўвання прадстаўлены ў асноўным дзяржаўныя ўстановы. Грамадскія арганізацыі пакуль



Фота БЕЛТА.

не праяўляюць асаблівай ініцыятывы, выключэнне складаюць хіба што Чырвоны Крыж і Беларускае таварыства інвалідаў па зроку. Значыць, ***трэба больш зацікавіць недзяржаўны сектар.*** Таму з кастрычніка мінулага года парламентарыі працуюць над праектам закона «Аб унясенні змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб сацыяльным абслугоўванні». Плануецца, што ў маі гэтага года законапраект будзе прыняты ў другім чытанні.

— У прыватнасці, будуць унесены змены ў палажэнне аб дзяржаўным сацыяльным заказе, — гаворыць **член Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь Таццяна СТАРЫНСКАЯ.** — Мы плануем павялічыць дзеянне тэрміну дагавора паміж мясцовымі органамі ўлады і грамадскай або недзяржаўнай арганізацыяй, якая збіраецца працаваць у рамках дзяржаўнага сацыяльнага заказу, да пяці гадоў. Цяпер гэты тэрмін складае адзін год, але пакуль пройдуць усе ўзгадненні, будуць выдзелены грошы, часу на рэалізацыю праекта звычайна застаецца зусім няшмат.

Яшчэ адна планаваная змена, якая будзе замацавана ў законе, датычыцца сітуацыі, калі ў конкурсе на выкананне дзяржаўнага сацыяльнага заказу ўдзельнічае толькі адна арганізацыя. Калі яна адпавядае ўсім неабходным патрабаванням, будзе лічыцца, што конкурс адбыўся. Такое змяненне вельмі актуальнае для раёнаў, дзе не так шмат недзяржаўных арганізацый, якія хацелі б удзельнічаць у падобных конкурсах.

* * *

Дарэчы, летам мінулага года быў прыняты закон аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве. Пад такім партнёрствам маецца на ўвазе сукупнасць формаў узаемадзеяння дзяржавы і бізнесу для вырашэння грамадска значных задач на ўзаемавыгадных умовах. Дзякуючы гэтаму ўжо сталі развівацца некаторыя сацыяльныя праекты з удзелам бізнесу. Напрыклад, у Гомелі плануецца рэалізаваць ***інвестыцыйны праект сацыяльнага кластара «Месца для кожнага»,*** у рамках якога на тэрыторыі сквера будзе створаны шматфункцыянальны сацыяльны комплекс, які будзе ўключаць у сябе аб'екты сацыяльнай значнасці для дзяцей, людзей з інваліднасцю і пажылых людзей. Гэты праект збіраецца рэалізоўваць расійскі інвестар.

Магчыма, прынцып дзяржаўна-прыватнага партнёрства можна спрабаваць прымяняць і ў сацабслугоўванні, але ўсё ж такі яго сутнасць заключаецца ў сумесных кантрактах органаў улады і бізнесу пры стварэнні патрэбнай інфраструктуры.

Што ж датычыцца паўсядзённага жыцця чалавека, які мае патрэбу ў сацыяльных паслугах, то апошнім часам у нас з'явіліся новыя цікавыя сацыяльныя ініцыятывы, як, напрыклад, ***краўдфандынг.*** Гэта так званае народнае інвеставанне: такі спосаб фінансавання праектаў, калі звычайныя людзі — патэнцыйныя пакупнікі, прыхільнікі або аднадумцы наўпрост праз інтэрнэт пераводзяць грошы аўтарам ідэі. У беларускім сегменце інтэрнэту ўжо ёсць тры пляцоўкі, дзе выстаўляюцца сацыяльныя праекты і пад іх збіраюцца грошы.

* * *

Але вернемся да закона аб сацыяльным абслугоўванні, згодна з якім на рынку сацыяльных паслуг павінны быць прадстаўлены дзяржаўныя і недзяржаўныя арганізацыі, а таксама прыватнікі.

У рэспубліцы ёсць нешматлікія станоўчыя ўзоры сацыяльнага прадпрымальніцтва, як, напрыклад, у Століне, дзе індывідуальны прадпрымальнік арганізаваў вытворчасць па перапрацоўцы старой плёнкі і ўзяў на працу асоб, залежных ад алкаголю. Цяпер у жыцці яго работнікаў адзначаюцца заўважныя змены да лепшага. Але такіх прыкладаў мала. І пакуль што практычна няма выпадкаў, калі б індывідуальны прадпрымальнік заняўся сацыяльным абслугоўваннем, хоць, як сцвярджаюць спецыялісты, магчымасці такія ёсць.

Трэба адзначыць, што спробы прыватнікаў працаваць у гэтай сферы былі, але пакуль іх нельга лічыць асабліва ўдалымі. У Валожынскім раёне працуе першы прыватны інтэрнат для пажылых людзей. У Віцебску адзін час з'явіліся прыватныя сядзелкі, але на рынку сацыяльных паслуг яны доўга не затрымаліся. Спецыялісты бачаць таму дзве прычыны. Першая — нізкая плацежаздольнасць кліентаў, другая — менталітэт нашых пажылых людзей, якія больш давяраюць дзяржаве, чым прыватніку.

Ключавой жа прычынай таго, што ў бізнесу няма асаблівай цікавасці да гэтага кірунку дзейнасці, з'яўляюцца невялікія прыбыткі ў названай сферы. У сацыяльным абслугоўванні практычна нулявая ці нават адмоўная рэнтабельнасць. А бізнес, нават з сацыяльнай накіраванасцю, застаецца бізнесам, ён павінен прыносіць даход, за кошт якога зможа існаваць у далейшым.

> Грамадскія арганізацыі пакуль не праяўляюць асаблівай ініцыятывы, выключэнне складаюць хіба што Чырвоны Крыж і Беларускае таварыства інвалідаў па зроку.

Эксперты лічаць, што адным з варыянтаў рашэння гэтага пытання магло б быць увядзенне дыферэнцыраванай аплаты аказання паслуг класа «люкс». Сярод некаторых спецыялістаў і прадстаўнікоў бізнесу таксама існуе меркаванне, што, каб бізнес прыйшоў у сацыяльную сферу, ён павінен мець прэферэнцыі ад дзяржавы. Гэта могуць быць падатковыя альбо нейкія іншыя льготы. Але перш за ўсё павінна быць жаданне і сацыяльная адказнасць. Дарэчы, у свеце яшчэ ў 70-х гадах мінулага стагоддзя з'явіўся такі тэрмін, як КСА — карпарацыйная сацыяльная адказнасць. КСА мае на ўвазе гатоўнасць бізнесу добраахвотна несці неабавязковыя выдаткі на сацыяльныя патрэбы звыш межаў, устаноўленых падатковым, працоўным, экалагічным і іншымі заканадаўствамі. Іншымі словамі, несці выдаткі на сацыяльныя патрэбы зыходзячы не з патрабаванняў закона, а па маральных, этычных меркаваннях. І перш за ўсё гэта датычыцца дапамогі мясцовым установам сацыяльнай сферы, маламаёмным сем'ям, інвалідам, сіротам і адзінокім састарэлым. У рэшце рэшт, дзякуючы такой дапамозе сацыяльна адказны бізнес атрымлівае і камерцыйныя перавагі — маецца на ўвазе павышэнне яго рэпутацыі ў вачах грамадскасці і ўрада.

Што датычыцца парламентарыяў, то яны ўпэўнены: каб бізнес укладваўся ў сацыяльныя праекты, трэба зразумець, якія яшчэ законы неабходна змяніць, каб стварыць прыватнаму сектару яшчэ больш спрыяльныя ўмовы для пранікнення ў гэтую сферу. «Думаю, пэўным рашэннем стане распрацоўка законапраекта аб сацыяльным прадпрымальніцтве», — лічыць Таццяна Старынская.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

## У тэму

• Сацыяльнымі паслугамі ў тым ці іншым выглядзе ў Беларусі карыстаюцца амаль 1,9 млн чалавек — практычна кожны пяты жыхар краіны. Менавіта столькі грамадзян стаіць цяпер на ўліку ў тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва (ТЦСАН).

• Як адзначаюць у Мінпрацы і сацыяльнай абароны, адзін з самых запатрабаваных на сённяшні дзень відаў сацыяльных паслуг — сацыяльна-бытавыя паслугі на даму, якія аказваюцца амаль 90 тысячам чалавек — непрацаздольным пажылым людзям і інвалідам. У гэтыя паслугі ўваходзіць набыццё і дастаўка прадуктаў харчавання, медыкаментаў і тавараў першай неабходнасці, афармленне дакументаў для аказання матэрыяльнай дапамогі, аплата камунальных паслуг.

• За мінулы год было заключана 50 дагавораў на аказанне сацыяльных паслуг недзяржаўнымі некамерцыйнымі арганізацыямі ў рамках дзяржаўнага сацыяльнага заказу: у Брэсцкай вобласці — 7 дагавораў, у Віцебскай вобласці — 8, у Гомельскай — 2, у Гродзенскай — 19, у Мінскай вобласці — 11, у Магілёўскай вобласці — 2, у Мінску — 1.

• У Брэсцкай і Магілёўскай абласцях прадоўжана рэалізацыя трох дагавораў, заключаных у 2015 годзе.

• У першым квартале гэтага года заключана 47 дагавораў на аказанне сацыяльных паслуг з недзяржаўнымі некамерцыйнымі арганізацыямі. Паслугі атрымалі 1071 чалавек.

ЗВЫЧАЙНАЯ ДАПАМОГА

# З АРЫЕНТАЦЫЯЙ НА «САЦЫЯЛКУ»

**Прыкладаў, калі прадпрымальнікі ўдзельнічаюць у сацыяльных праектах, можна прывадзіць шмат. У Камітэце па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Магілёўскага аблвыканкама запэўніваюць, што амаль ніхто ў гэтым не адмаўляе. Праўда, большасць абмяжоўваецца разавай дапамогай, але ёсць і такія, хто займаецца гэтым рэгулярна. Нашы сённяшнія суразмоўцы адны з тых, хто будуе сваю працу на ўмовах сацыяльнага прадпрымальніцтва.**




Сяргей НЕСЦЕРАЎ па суботах выконвае сацыяльныя рэйсы.

## «Мне падабаецца дапамагаць»

**Ірына МАКСІМАВА, заснавальніца прыватнага прадпрыемства «Свет здароўя і прыгажосці»** ў Магілёве, па праграме адаптацыі інвалідаў працуе ўжо больш за пяць гадоў. Расказвае, што ўсё пачалося з удзелу ў Дні інваліда, на які іх аднойчы запрасіў у якасці спонсара тэрытарыяльны цэнтр сацабслугоўвання Кастрычніцкага раёна.

— Пасля гэтага мамы хворых дзяцей сталі прыходзіць да нас на бясплатныя заняткі фітнесам, а наша інструктар займацца з ахвотнымі непасрэдна ў цэнтры сацабслугоўвання. Потым мне прапанавалі дапамагчы з працаўладкаваннем інвалідаў, і я пагадзілася, — расказвае Ірына. — У нас вельмі камфортныя ўмовы і няма нейкага размежавання, інвалід ты ці здаровы. Аднойчы прыйшла жанчына, якой на вытворчасці адарвала руку. Яна моцна камплексавала з гэтай нагоды. Але стала працаваць у нас і хутка адчула сябе паўнавартасным чалавекам. Ніхто не звяртаў увагі на тое, ёсць у яе рука або няма... Хутка асвоілася і дзяўчына з ДЦП, прычым вельмі сур'ёзнай ступенню захворвання. У яе была моцна парушана каардынацыя. Але мы таксама пасябравалі, яна нават удзельнічала ў нашых мерапрыемствах. Былі інваліды па зроку, людзі з захворваннямі на шчытападобную залозу, з дэфектамі канечнасцяў. Цяпер вось бяром 25-гадовую дзяўчыну з эпілепсіяй.

Фірма не толькі працаўладкоўвае людзей з абмежаванымі магчымасцямі, але і займацца спонсарскай дзейнасцю. Напрыклад, група пенсіянерак, самай старэйшай з якіх 80 гадоў, наведвае фітнес-клуб па льготных расцэнках. Сярод устаноў, якім аказваецца дапамога, — Магілёўскі дзяржаўны эканамічны прафесійна-тэхнічны каледж, дзе вучацца ў тым ліку і інваліды, папраўчая калонія Магілёва для непаўналетніх асуджаных. У законапаслухмяных выхаванцаў гэтай установы ёсць магчымасць бясплатна займацца ў фітнес-клубе. За сваю сацыяльна арыентаваную дзейнасць Ірына некалькі гадоў таму атрымала падзяку ад старшыні аблвыканкама. «Мне падабаецца займацца дабрачыннасцю, — прызнаецца яна. — Людзі, якія трапілі ў бяду, вельмі добразычлівыя. З імі, можа, і складана, але адчуваеш, як ім патрэбна гэтая дапамога. І гэтае пачуццё дае сілы».



Ірына МАКСІМАВА прымае ў сваім фітнес-клубе выхаванцаў са спецшколы.

## «На ўсё патрэбны грошы»

— Запрашаем на працу інвалідаў і маладых спецыялістаў. Адным словам, тых, каму цяжэй знайсці працу, чым здароваму чалавеку, — кажа **заснавальніца яшчэ аднаго магілёўскага прыватнага прадпрыемства «Аэліт-мама» Святлана АКУЛЕНКА.** Першапачаткова фірма спецыялізавалася на паслугах для мам і дзяцей — праводзіла курсы падрыхтоўкі да родаў, масаж, плаванне для дзяцей, пачынаючы з першага месяца жыцця. Потым тут сталі практыкаваць фізкультурна-аздараўленчую дзейнасць, дадаткова адкрылі трэнажорную залу, цырульню. Арганізавалі нават сустаўную гімнастыку для жанчын ва ўзросце. Паслуга, дарэчы, вельмі запатрабаваная.

Святлана, як і Ірына, працуе па праграме адаптацыі інвалідаў. Яна, дарэчы, мае медыцынскую адукацыю і 8 гадоў медыцынскага стажу.

Сярод работнікаў фірмы — таксама інваліды 2-й і 3-й груп з дзяцінства або тыя, хто стаў імі ў выніку няшчасных выпадкаў ці сур'ёзных захворванняў. Апошнім часам шмат звяртаецца людзей, якія атрымалі інваліднасць пасля аперацыі па анкалогіі. Некаторыя саіскальнікі прыходзяць у «Аэліт-маму» праз тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання Кастрычніцкага раёна, з якім фірма месціцца ў адным будынку. Святлана заўсёды ў курсе навін магілёўскага таварыства інвалідаў, падтрымлівае з ім цесныя кантакты.

Штат прадпрыемства невялікі — 15 чалавек, але першапачаткова тут ужо было прадугледжана 3 працоўныя месцы для маладых спецыялістаў і 4-5 для інвалідаў. «Можна было б працаўладкаваць і больш чалавек, але на ўсё патрэбны грошы, — уздыхае Святлана. — Калі б дзяржава дапамагла з фінансамі... А так — абсталяваць адно працоўнае месца для інваліда сёння каштуе 2-3 тысячы рублёў. У нас, напрыклад, працуе адміністратар з кампрэсійным пераломам пазваночніка. Прыйшлося шукаць спецыяльнай формы крэсла, бо сядзець на звычайным яна не магла. Або наша прыбіральшчыца — інвалід з дзяцінства, у якой замест тазасцегнавага сустава імплантат. Ёй цяжка нахіляцца, патрэбны спецыяльны пыласос. Ды і псіхалагічна такіх людзей неабходна падтрымліваць, інваліды часта камплексуюць. Прыйшла нейкая жанчына з вышэйшай адукацыяй, якая па стане здароўя не магла працаваць па прафесіі. Яна доўга прывыкала да таго, што стала прыбіральшчыцай. Некалькі месяцаў пераконвалі яе, што нічога ганебнага ў яе працы няма. Саромецца павінны тыя, хто наогул не працуе.

## Непрадпрымальны... перавозчык

Былы марак-падводнік Мікалай Кустоўскі жыве ў Быхаве, але цяжкае захворванне прымушае яго рэгулярна ездзіць на гемадыяліз у Магілёў. І ён вельмі ўдзячны мясцоваму прадпрымальніку Сяргею Несцераву, які кожную суботу давозіць яго з Быхава непасрэдна да ўвахода ў абласную бальніцу.

— Сёння на 6.30 раніцы гэта быў адзіны мой пасажыр, — тлумачыць Сяргей, калі пенсіянер адпраўляецца на чарговы сеанс. На гадзінніку 7.30. У палове 12-й мужчыну трэба будзе забраць і адвезці назад у Быхаў. Да гэтага часу перавозчык паспее здзейсніць яшчэ два рэйсы. Перавозкі — яго бізнес, але ён працуе ад аўтапарка. І дадатковы рэйс, які ён здзяйсняе па ўзгадненні з упраўленнем па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Быхаўскага райвыканкама, для яго зусім не прыбытковы. Спачатку хворых было сямёра, і Несцераў вазіў іх туды і назад тройчы на тыдзень. Зараз гемадыяліз патрэбны толькі двум. Таму сацыяльны рэйс у яго застаўся адзін — па суботах. Калі пашчасціць з пасажырамі на іншых рэйсах, можна лічыць, што паездка акупілася. Але вельмі часта зрабіць гэта перашкаджаюць нелегалы. Пасажыры не паспяваюць нават дайсці да касы, як іх «ужо перахоплліваюць». Сяргей Несцераў нават у Міністэрства транспарту звяртаўся, каб абаранілі інтарэсы сваіх перавозчыкаў, але той ліст «спусцілі» на вобласць. А мясцовыя ўлады што могуць зрабіць? Нелегалаў яшчэ трэба за руку схапіць. Да таго ж яны таксама маюць ліцэнзію на перавозкі.

Сяргей, па сутнасці, мог бы таксама працаваць як «вольны мастак». Але сумленне не дазваляе. «Я ж у Савецкім Саюзе выхоўваўся», — усміхаецца ён. І прызнаецца, што было б лягчэй працаваць, калі б для такіх, як ён, перавозчыкаў існавалі льготы. Усё ж такі ён — у адрозненне ад сваіх прадпрымальных калег — выконвае сацыяльныя рэйсы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*
**Фота аўтара і з архіваў Ірыны Максімавай і Святланы Акуленкі.**

МЕРКАВАННІ

# ХТО ПАВІНЕН ЗА ГЭТА АДКАЗВАЦЬ?

**У Беларусі сёння аказваюць шырокі спектр сацыяльных паслуг, аднак у большасці выпадкаў гэтым займаюцца дзяржаўныя структуры. Прыватнікі таксама выходзяць на сацыяльны рынак, але пакуль ён не надта развіты. Мы задалі нашым экспертам пытанне: хто павінен аказваць сацыяльныя паслугі насельніцтву — дзяржава ці прыватныя кампаніі?**

**Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Алег ЛЕЎШУНОЎ** лічыць, што працаваць трэба разам:

— Справа ў тым, што цяпер дзяржава мае сур'ёзныя бюджэтныя выдаткі на выкананне сваіх сацыяльных абавязацельстваў, якія прадугледжвае Канстытуцыя. І наша краіна добрасумленна выконвае гэтыя функцыі. Але я лічу, пры сённяшняй сітуацыі, калі не хапае фінансаў, мы павінны вельмі шчыльна развіваць дзяржаўна-прыватнае партнёрства, выкарыстоўваць капітал камерцыйных структур для агульнай карысці. І такі вопыт ужо ёсць: адкрываюцца прыватныя дамы для састарэлых людзей, дзе аказваецца ўсялякая дапамога. Інакш кажучы, можна зніжаць нагрузку на бюджэт за кошт развіцця бізнесу ў гэтым кірунку.

Падтрымлівае такі пункт гледжання і **першы сакратар Мінскага гарадскога камітэта грамадскага аб'яднання «БРСМ» Сяргей КЛІШЭВІЧ:**

— Раз у нас сацыяльна-арыентаваная дзяржава, то я думаю, што гэта прэрагатыва краіны разам з грамадскасцю, у якой нямала канструктыўных ідэй і праектаў. Сацыяльныя паслугі павінны аказвацца выключна ў цесным узаемадзеянні грамадскіх аб'яднанняў і дзяржавы. А прыватнікі — гэта важны складальнік, але ён павінен падключацца да нейкіх канкрэтных праектаў, прапанаваных дзяржавай, бо кіраўніцтву нашай краіны лепш відаць, у якіх кірунках трэба развіваць сацыяльную актыўнасць і дапамогу тым ці іншым грамадзянам. Я лічу, што дзяржава ў гэтай сітуацыі павінна быць органам, які курыруе і накіроўвае, а работа павінна выконвацца грамадскасцю і ў нейкай меры прыватнымі арганізацыямі. Але працаваць тут павінны ўсе, бо ў нашага народа ў крыві — дапамагаць адно аднаму і разам вырашаць тыя ці іншыя пытанні. Дзейнасць БРСМ можна ў прынцыпе назваць сацыяльна карыснай. Бо людзям, якім патрэбна дапамога, мы заўсёды яе аказваем.

**Старшыня дабрачыннага грамадскага аб'яднання «Свет без межаў» Таццяна ПАЕЎСКАЯ** у вырашэнні гэтага пытання прапануе абапірацца на замежны вопыт:

— Маё меркаванне такое: сацыяльныя паслугі павінны рэалізоўвацца па дзяржаўным заказе, але прыватнымі кампаніямі. Чаму? Таму што я бачу, як гэта працуе ў іншых краінах. Напрыклад, у Польшчы і Латвіі ёсць такая форма ўзаемадзеяння, і яна вельмі добра дзейнічае. Дапусцім, на чалавека з інваліднасцю вылучаецца пэўная сума. І гэтыя грошы ідуць за прыватным кліентам, а не за работнікамі. Але трэба, каб увесь працэс перадачы сацыяльнага заказу прыватным або грамадскім арганізацыям быў прадуманы. Перавага такога рашэння заключаецца ў тым, што прыватнікі зацікаўлены выконваць работу вельмі якасна для развіцця пастаяннай кліентуры. У такіх арганізацыях работа залежыць не ад гадзін выпрацоўкі, а менавіта ад якасці — гэта вельмі важная дэталь. Сацыяльны заказ ужо ёсць у Беларусі, проста яго неабходна дапрацоўваць. Наша арганізацыя не працуе ў такім фармаце, але мы хацелі б да гэтага прыйсці.

**Дырэктар прыватнага Войганаўскага дома-інтэрната «Сямейны прычал» Алена ДУБОВІК** падкрэслівае, што кожны з бакоў можа аказваць паслугі розным слаям насельніцтва:

— Я лічу, што аказваць сацыяльныя паслугі насельніцтву павінны і прыватныя арганізацыі, і дзяржава. Растлумачу: прыватную кампанію краіна не фінансуе, таму мы можам прыняць да сябе людзей, якія ў стане сябе забяспечыць матэрыяльна, гэта значыць на платнай аснове. А ёсць вельмі шмат людзей, у якіх мінімальная пенсія, адпаведна, ні адзін прыватнік не будзе іх браць, таму што гэта праца ў страту, нават у нуль не атрымаецца выйсці. Мы, як прыватная арганізацыя, знаходзімся на самазабеспячэнні, у нас свае прадукты, мы працуем самі на сябе. Дарэчы, акрамя звычайных «платнікаў», у нас знаходзяцца дзесяць «сацыяльнікаў». Таму мы сёння мы і ўзаемадзейнічаем з дзяржавай у сферы сацыяльных паслуг.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

# РАБОТА ЯК ЗНАХОДКА

## Па праграме працоўнай рэабілітацыі прадпрыемства ўладкоўвае людзей з абмежаванымі магчымасцямі

**Удвары рэчыцкага прадпрыемства складзеныя дзясяткі, калі не сотні тон адпрацаванай плёнкі. Прыватнае вытворча-гандлёвае ўнітарнае прадпрыемства «Столін-Перапрацоўка плёнкі» мае ярка выражаны экалагічны кірунак. Завод ператварае шкодныя адходы ў новую прадукцыю. Плёнку, як і іншы пластык, як вядома, нельга спаліць, нельга ў зямлю закапаць. У Рэчыцы яе перапрацоўваюць.**

Цікава, што сярод велізарных рулонаў плёнкі (якая была некалі цяпліцай, упакоўкай, служыла іншым карысным мэтам і мае цяпер адпаведны выгляд) нярэдка трапляюцца скруткі завадской упакоўкі. На іх відаць лагатыпы «Санты», «Савушкіна прадукта», іншых вядомых вытворцаў. Аказваецца, брак. Скажам, на этыкетцы прапусцілі слова ці нават літару, і ўся партыя пластыкавых пасудзін адпраўляецца на перапрацоўку. І яшчэ дзясяткі самых розных адходаў сінтэтычнага паходжання трапляюць на названае прадпрыемства. Адным словам, невялікі смеццеперапрацоўчы завод з поўным цыклам вытворчасці. Па тэхналогіі сыравіну, гэта значыць адходы, трэба перабраць, пасартаваць, потым памыць у спецыяльных машынах, каб пасля гэтага пусціць у станкі, якія выпрацуюць гранулы — гатовую прадукцыю прадпрыемства.

Завод працуе кругласутачна, без выхадных і святочных дзён. За суткі перапрацоўваецца ад трох да чатырох тон сыравіны. Зараз прадпрыемства мае дагаворы больш чым з трыма сотнямі пастаўшчыкоў сыравіны. Плёнку і іншы пластык вязуць у Рэчыцу не толькі з Брэстчыны, але і з усіх абласцей Беларусі. Большая частка гатовай прадукцыі накіроўваецца ў Расію.

Стварыў завод у гарадскім пасёлку Рэчыца столінскі прадпрымальнік Аляксандр ДЗЕРАВЕНКА з групай аднадумцаў. Рашэннем райвыканкама ім прадалі былую вытворчую базу райсельгастэхнікі. Вядома, давялося рамантаваць памяшканні, якія выкарыстоўваліся ў тым ліку пад склады мінеральных угнаенняў, праводзіць ацяпленне, даводзіць цэхі да ладу, каб потым паставіць станкі. І вось цяпер абсталяванне задзейнічана на поўную магутнасць. А на прадпрыемстве зараз занятыя 58 чалавек. Для сельскай мясцовасці не малая вытворчасць.

Завод працуе чацвёрты год. Калі ён быў на стадыі станаўлення, упраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Столінскага райвыканкама вызначыла пазыку пад стварэнне рабочых месцаў.

— Хоць і невялікія былі грошы, 450 мільёнаў рублёў, адзін наш станок каштуе крыху больш, — гаворыць Аляксандр Дзеравенка, — але на той час дапамога выглядала вельмі своечасовай. Мы кожны рубель лічылі, як і цяпер лічым. Ужо з той пазыкай разлічыліся, але з людзьмі сацыяльна ўразлівых катэгорый працягваем працаваць і цяпер.

Сёння на прадпрыемстве маюць рабочыя месцы чатыры інваліды. Трое з іх былі на змене ў дзень прыезду карэспандэнта, з імі ўдалося пагаварыць. Самы малады — Павел Шастак. Паўлу



Дырэктар Аляксандр ДЗЕРАВЕНКА *(злева)* у цэху.

19 гадоў, ён інвалід па зроку, рэчыцкае прадпрыемства стала яго першым рабочым месцам. Той узровень зроку, які ёсць, дазваляе хлопцу працаваць сарціроўшчыкам. Паводле слоў кіраўнікоў, Павел з работай спраўляецца. Сам работнік вельмі задаволены — ён можа не сядзець дома, фактычна на шыі ў сям'і, а зарабляць для сябе рэальныя грошы. Рэжым работы маладога сарціроўшчыка задавальняе, ён ездзіць сюды са Століна, гэта недалёка, аўтобус ходзіць рэгулярна.

Ігару Гміру 23 гады, ён жыве ў Рэчыцы. Малады чалавек з самых юных гадоў добра зарабляў на будоўлях Расіі. Працаваў многа, таму не быў абмежаваны ў сродках, адным словам, прывык ствараць дабрабыт сваімі рукамі. Ды здарылася бяда, Ігар атрымаў траўму пазваночніка. Лячэнне і рэабілітацыя занялі амаль два гады, яшчэ і цяпер ёсць пэўныя абмежаванні ў рабоце, асабліва ў той частцы, якая мае на ўвазе нагрузку на пазваночнік. Адным словам, многа падымаць нельга.

— Уяўляеце, як цяжка было сядзець дома, калі прывык працаваць, зарабляць капейку? — гаворыць хлопец. — Таму работа побач з домам была як знаходка. Працую з васьмі да пяці з двума выхаднымі, маю рэальны заробак.

У Алены Дульскай свая гісторыя. Шмат гадоў таму на сельгасработах яна атрымала траўму, засталася без пальцаў на руцэ. Увесь час Алена Фёдараўна знаходзіла работу па сілах, апошнія гады працавала кандуктарам у аўтапарку. А мінулым летам, калі сродкам разліку з пасажырамі сталі ў асноўным капейкі, працаваць са сваёй інваліднасцю проста не змагла, давялося звальняцца.

— Работу ў горадзе цяпер знайсці практычна немагчыма з маімі абмежаваннямі, — кажа Алена. — А без работы мне ніяк нельга. Дачка заканчвае 11 клас: выпускныя, рэпетытары, самі разумееце. Таму я вельмі ўдзячная за магчымасць папрацаваць па праграме рэабілітацыі інвалідаў, спадзяюся, што і пасля заканчэння праграмы, якая разлічаная на год, застануся тут.

Яшчэ на заводзе працуе абавязаная асоба Марына. Пра яе работнікі-калегі гавораць найбольш са шкадаваннем. Зусім бядовая дзяўчына. Забралі ў яе дзіця, саму ўладкавалі на працу. Калі яна цвярозая і працуе, то ледзь не лепш за ўсіх, работа ў руках гарыць. А як толькі не ўтрымаецца — тыдзень не знойдзеш, бо столькі цягнецца запой. Дырэктар гаворыць, што спрабаваў дастукацца да яе свядомасці, можа, дзесяць разоў. «І здаецца, усё разумее, хацела б вярнуць дзіця, наладзіць жыццё. Але ёй патрэбна сур'ёзнае лячэнне ад алкагалізму, — прыйшоў да высновы Аляксандр Адамавіч. — Прафілактычныя меры, працатэрапія ўжо не дапамогуць. Мы яе не звальняем за прагулы, але ў міліцыі сказалі, што яшчэ адно такое парушэнне працоўнай дысцыпліны — і адправяць у ЛПП».

Па праграме рэабілітацыі раней асуджаных на «Столін-Перапрацоўка плёнкі» з нядаўняга часу працуе Валянцін. Як сказалі, працуе без заўваг і нараканняў.

* * *

Рэчыцкае прадпрыемства адносна новае, яно актыўна развіваецца. Паводле слоў дырэктара, за мінулы год магутнасць павялічылася больш чым у два разы. Яшчэ нейкі год таму тут працавала каля 30 чалавек, цяпер амаль удвая больш. Калі б крэдыт у банку было ўзяць лягчэй, чым цяпер, разважае Аляксандр Дзеравенка, купілі б дадаткова абсталявання, стварылі б яшчэ рабочыя месцы. Тым больш што амаль кожны ранак ля ўваходу дырэктара сустракаюць два-тры чалавекі, якія хацелі б атрымаць работу. Але і ў цяперашніх умовах тут маюць намер паступова пашыраць вытворчасць.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
yackevich@zviazda.by

*Столінскі раён.*



Ігар ГМІР.

**Намеснік начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Столінскага райвыканкама Генадзь ЯХНАВЕЦ** гаворыць, што прадпрыемства ў Рэчыцы і ёсць прыклад прыватна-дзяржаўнага партнёрства ў справе рэабілітацыі сацыяльна ўразлівых катэгорый насельніцтва:

— Мы ў свой час паспрыялі стварэнню там дадатковых рабочых месцаў, — працягвае Генадзь Мікалаевіч, — і не памыліліся. Прадпрымальнік Аляксандр Дзеравенка паказвае прыклад сацыяльнай адказнасці бізнесу. Цяпер у яго працуе чатыры інваліды, на кожнага з якіх па праграме працоўнай рэабілітацыі з бюджэту выплачваецца кампенсацыя ў памеры іх зарплаты. Для работніка праграма дзейнічае шэсць месяцаў, потым, калі патрэбна, можа быць падоўжана да года. Прыкладна такія ж выплаты налічваюцца ў выпадку працаўладкавання асоб, якія вярнуліся з месцаў пазбаўлення волі. У гэтым годзе завод заявіў аб гатоўнасці ўладкаваць яшчэ пяць інвалідаў. Пры тым што для людзей з абмежаванымі магчымасцямі створаны асаблівы рэжым работы: яны не працуюць у начную змену, іх графік работы абмяжоўваецца часам з васьмі раніцы да сямнаццаці вечара.

ПРЫЗНАННЕ

# ЭКСКЛЮЗІЎНАЯ ІНКЛЮЗІЯ АД БДПУ

**Беларускаму дзяржаўнаму педагагічнаму ўніверсітэту імя Максіма Танка прысвоены статус базавай арганізацыі дзяржаў — удзельніц СНД па падрыхтоўцы, перападрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі педагагічных работнікаў і спецыялістаў у галіне інклюзіўнай і спецыяльнай адукацыі. Такое рашэнне было прынята на пасяджэнні Савета па супрацоўніцтве ў галіне адукацыі СНД у Маскве.**

Як адзначае рэктар Аляксандр ЖУК, Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт мае глыбокія гістарычныя карані, аўтарытэт і прызнанне ў якасці самай магутнай навукова-педагагічнай школы па падрыхтоўцы настаўнікаў-дэфектолагаў. У верасні 2016 года на базе БДПУ быў створаны Інстытут інклюзіўнай адукацыі. Ён падтрымлівае цесныя сувязі з навуковымі і адукацыйнымі арганізацыямі краін СНД, Швецыі, Германіі, Нарвегіі і Нідэрландаў. Міжнароднае супрацоўніцтва рэалізуецца ў розных формах: выкананні сумесных навуковых даследаванняў і рэалізацыі міжнародных праектаў, акадэмічным абмене студэнтамі і выкладчыкамі, распрацоўцы сумесных праграм сеткавай магістратуры.

Унікальныя магчымасці з'явіліся ў сувязі з нядаўнім адкрыццём у Інстытуце інклюзіўнай адукацыі ў партнёрстве з Дзіцячым фондам ААН (ЮНІСЕФ) Рэспубліканскага рэсурснага цэнтра інклюзіўнай адукацыі. Ён дазволіць забяспечыць высокую якасць падрыхтоўкі будучых педагогаў, павысіць кваліфікацыю ўжо практыкуючых педагогаў, а таксама кансалідаваць намаганні сістэмы адукацыі і грамадзянскай супольнасці ў забеспячэнні якасці інклюзіўнай адукацыі для ўсіх яе ўдзельнікаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
nikalaeva@zviazda.by

# ИЗВЕЩЕНИЕ
## О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении торгов в виде открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, на которое обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства по поручению Бобруйского межрайонного отдела Управления по Могилевской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь**

ЛОТ №1. **Капитальное строение с инв. №714/С-22118 – баня**, расположенное по адресу: Могилевская обл, Осиповичский р-н, г. Осиповичи, ул. Юбилейная, 57, общ. пл. 247,7 кв. м, фундамент – бетонный, стены – кирпичные, перегородки – кирпичные, перекрытия – ж/бетонные, г. п. – 1984.

**Капитальное строение с инв. №714/С-21457 – линия электропередач (доля в праве собственности 139/100)**, расположенное по адресу: Могилевская обл, Осиповичский р-н, г. Осиповичи, ул. Юбилейная, 57, вид сети – кабельная, способ прокладки – траншейный, марка – ААШВ 3х120, протяженность – 92,5 м, дата ввода – 1984.

Сведения о земельном участке: земельный участок с кадастровым номером 724850100001002389, площадью – 0,0590 га, предоставлен на праве аренды (по 15.02.2072), назначение – земельный участок для обслуживания бани.

**Начальная цена продажи – 38 119,68 бел. руб.**
**Сумма задатка – 3 811,97 бел. руб.**

| | |
|---|---|
| **Расчетный счет для перечисления задатка** | Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, МФО 153001369 |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **Аукцион проводится 13 июня 2017 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 99, офис Могилевского филиала РУП «Институт недвижимости и оценки». Последний день подачи заявок и внесения задатка: 12 июня 2017 года до 15.00 |
| **Срок и условия оплаты приобретенного с аукциона имущества** | В течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола аукциона на расчетный счет Организатора аукциона |
| **Обременение** | Арест ИМНС РБ по Осиповичскому району с 09.02.2017 |

